Установа адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

Кафедра гісторыі Беларусі

# Вялікая Айчынная вайна савецкага народа
# /у кантэксце Другой сусветнай вайны/

Метадычныя рэкамендацыі

Репозиторий БрГУ

Брэст
БрДУ імя А.С. Пушкіна
2011

УДК 94(47+57)

ББК 63.3(2)622
В 99

Аўтары-складальнікі:

кандыдат гістарычных навук, дацэнт П.С. Рамановіч
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Л.І. Ермаковіч

Эксперт:
доктар гістарычных навук, прафесар
**А.А. Гарбацкі**

Рэкамендавана да выдання
на пасяджэнні кафедры гісторыі Беларусі
пратакол № 7 от 30.03.2011 г.

Рамановіч П.С.
Ермаковіч Л.І.
Вялікая Айчынная вайна савецкага народа /у кантэксце Другой сусветнай вайны/ : Л.І. Ермаковіч, П.С. Рамановіч; Брэсц.дзярж.ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2011. – С.

Метадычныя рэкамендацыі ўключаюць важнейшыя пытанні супярэчлівых адносін паміж дзяржавамі напярэдадні і ў час Другой сусветнай вайны, значная ўвага ўдзелена барацьбе савецкага народа супраць германскай агрэсіі, а таксама баявых дзеянняў на Захадзе.

Метадычныя рэкамендацыі прызначаны для выкладчыкаў і студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання.

УДК 94(47+57)

ББК 63.3(2)622
В 99

©Издательство УО “БрГУ
им. А.С. Пушкина”, 2011

Репозиторий БрГУ

## ЗМЕСТ

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Уводзіны………………………………………………..… | 4 |
| 2. | Тэма 1. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны ……………………………………………… | 5 |
| 3. | Тэма 2. Пачатак Другой сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі……………………………………………………..….. | 9 |
| 4. | Тэма 3. Акупацыя Германіяй краін Еўропы ………….….… | 11 |
| 5. | Тэма 4. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ….…. | 12 |
| 6. | Тэма 5. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны………………… | 13 |
| 7. | Тэма 6. Акупацыйны рэжым………………………………… | 18 |
| 8. | Тэма 7. Партызанская і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі…………………………………… | 20 |
| 9. | Тэма 8. Падзеі на франтах вайны. Крушэнне наступальнай стратэгіі германскага вермахта………………………… | 24 |
| 10. | Тэма 9. Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў…… | 27 |
| 11. | Тэма 10. Савецкі тыл у гады вайны………………………. | 29 |
| | Тэма 11. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў………………………………………………………. | 32 |
| 12. | Заключэнне ……………………………………………...…. | 35 |
| 13. | Літаратура……………………………………………….. | 36 |

Репозиторий БрГУ

# УВОДЗІНЫ

Усё далей і далей у гісторыю адыходзяць гады Другой сусветнай вайны. У свядомасці цэлых нацый і народаў унікальнае месца займае гістарычная памяць пра Другую сусветную, а для нашага народа – пра Вялікую Айчынную вайну. Мінулая вайна – гэта не проста гераічная падзея сусветнай гісторыі ХХ ст. Яна па прычыне сваёй маштабнасці прымушае зноў звярнуцца да той духоўнай спадчыны, якой гісторыя сустракала і праводзіла войны, спадзяючыся, што гэта ў апошні раз.

Другую сусветную вайну (а Вялікую Айчынную тым больш) нельга разглядаць як вайну, выкліканую толькі супярэчнасцямі паміж заходнімі дзяржавамі, Германіяй і Савецкім Саюзам. Фашызм як практыка ёсць непазбежнае ўзвышэнне і перабольшванне “свайго” нацыянальнага (этнічнага) зместу, прыніжэнне носьбітаў іншых этнічных вартасцей, нават праз іх фізічную ліквідацыю. Знішчэнне яўрэяў, цыганоў, палякаў, прадстаўнікоў іншых нацый – гэта сведчанне этнічнай вайны, асэнсаванасць якой яшчэ далёкае ад завяршэння.

Вывучэнне гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь з’яўляецца адной з галоўных задач гуманітарнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі.

Асноўнымі задачамі метадычных парад вызначаны наступныя: засваенне вучэбнага матэрыялу аб гераічных і трагічных старонках Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў; аб укладзе народаў Беларусі ў разгром нямецкіх захопнікаў; фарміраванне ў студэнцкай моладзі грамадзянскіх і патрыятычных якасцей.

Рэпазіторый БрДУ

## Т э м а 1. МІЖНАРОДНАЕ СТАНОВІШЧА НАПЯРЭДАДНІ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Прыступаючы да вывучэння тэмы “Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны”, вылучым наступныя вузлавыя пытанні:

1. Фарміраванне фашысцкага блока і ачагі ваеннай напружанасці (Д. Усход, Еўропа, Афрыка). Мюнхенскае пагадненне.
2. Спроба стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе.
3. Савецка-германскія дагаворы. Сакрэтны пратакол.

Пераходзячы да разгляду акрэсленых пытанняў, найперш адзначым, што 1930-я гг. – складаны перыяд у развіцці міжнародных адносін. 30 студзеня 1933 г. ў Германіі да ўлады прыйшла нацыянал-сацыялістычная партыя (кіраўнік А. Гітлер). Фашысцкая Германія:

– паставіла задачу ўсімі сродкамі дабіцца скасавання абмежаванняў, прадугледжаных Версальскім дагаворам;

– адмовілася ўдзельнічаць у стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі;

– у кастрычніку 1933 г. выйшла з Лігі Нацый, адмовілася ад Жэнеўскай канферэнцыі па разбраенні 1932–1935 гг.;

– у сакавіку 1935 г. парвала Версальскі мірны дагавор і аб'явіла ўсеагульную воінскую павіннасць;

– пачала ствараць моцную армію і флот (да канца 1935 г. была сфарміравана 31 баяздольная дывізія, пабудавана 300 новых ваенных заводаў, ваенная вытворчасць з 1934 па 1940 гг. вырасла ў 22 разы);

– летам 1935 г. падпісала з Англіяй марское пагадненне, якое дазволіла Германіі распачаць будаўніцтва падводных лодак;

– у 1936 г. у мемарандуме была выкладзена праграма эканамічнай падрыхтоўкі да вайны.

Такія дзеянні нямецкага ўрада сведчылі, што Германія ператваралася ў небяспечны ачаг ваеннай пагрозы ў Еўропе і ў свеце. Каб усвядоміць усю небяспечнасць для народаў свету падрыхтоўкі Германіі да новых тэрытарыяльных перадзелаў, важна падкрэсліць, што ідэалагічным забеспячэннем палітыкі нацыянал-сацыялізму сталі прапаганда шавінізму і расавай выключнасці германскай нацыі, варожасці і ненавісці да іншых народаў.

Трэба абавязкова звярнуць увагу студэнтаў на імкненне германскага кіраўніцтва ўмацаваць ваенна-палітычнае супрацоўніцтва з экстрэмісцкімі рэжымамі і стварыць ваенна-палітычны блок:

– 24 кастрычніка 1936 г. Германія і Італія падпісалі пагадненне аб утварэнні “Восі Берлін-Рым” (Германія прызнала анексію Італіяй Эфіопіі);

Репозиторий БрГУ

– 25 лістапада 1936 г. Германія і Японія заключылі “Антыкамінтэрнаўскі пакт”, які заклаў асновы ваенна-палітычнага саюза трох агрэсараў, што прывяло да падзелу сфер уплыву ў Еўропе і Азіі;

– 27 верасня 1940 г. Германія, Італія і Японія заключылі ў Берліне ваенна-палітычны і эканамічны саюз – “Траісты пакт” (“Вось Берлін – Рым-Токіо”).

Да пачатку 1939 г. да гэтага блока далучыліся Венгрыя, Іспанія, а ў лістападзе 1941 г. – Балгарыя, Фінляндыя, Румынія, Манчжоў-го, а таксама акупіраваныя нямецкімі войскамі Данія, Славакія і Харватыя.

Рост ваеннай паружанасці ў хуткім часе пераўтварыўся ў шэраг агрэсіўных дзеянняў:

– у верасні 1931 г. японскія войскі акупіравалі Маньчжурыю і стварылі марыянетачную дзяржаву Манчжоў-го з праяпонскім урадам. У сакавіку 1933 г. Японія выйшла з Лігі Нацый;

– у кастрычніку 1935 г. італьянская армія напала на Абісінію (Эфіопію);

– 7 сакавіка 1936 г. германскія войскі занялі Рэйнскую дэмілітарызаваную зону. Гэта пагражала бяспецы Францыі, але французскі ўрад бяздзейнічаў, тым больш, што суадносіны сіл былі не на карысць Германіі (яна мела 36 дывізій, а Францыя і Чэхаславакія – 55);

– у ліпені 1936 г. у Іспаніі пачаўся ваенны мяцеж супраць рэспубліканскай улады. Германія і Італія падтрымалі франкістаў (з 1936 па 1939 гг. на баку франкістаў ваявала каля 150 тыс. вайскоўцаў з Італіі, 50 тыс. з Германіі, 20 тыс. партугальцаў і каля 100 тыс. мараканцаў). Ліга Нацый бяздзейнічала, а 27 краін Еўропы падпісалі пагадненне аб неўмяшанні. У сакавіку 1939 г. Іспанская рэспубліка пала і ў краіне ўсталявалася дыктатура генерала Ф. Франка;

– у 1937 г. японскія войскі разгарнулі ваенныя дзеянні ў Цэнтральным Кітаі. Савецкі саюз 27 жніўня 1937 г. заключыў з Кітаем дагавор аб ненападзе і аказаў ваенную дапамогу (было пастаўлена 600 самалетаў, 1 тыс. гармат, 8 тыс. кулямётаў, накіравана 3665 савецкіх ваенных спецыялістаў);

– у сакавіку 1938 г. 200 тыс. нямецкая армія захапіла Аўстрыю і было абвешчана аб яе “уз'яднанні” (аншлюс) з Германіяй;

– летам 1938 г. японскія войскі захапілі частку тэрыторыі СССР каля возера Хасан, але былі разгромлены. У маі-жніўні 1939 г. у раёне р.Халкін-Гол (МНР) савецка-мангольскія войскі разграмілі 40 тыс. японскую групоўку войск. Такім чынам, рост мілітарызму і рэваншызму ў 1930-я гг. прывялі да рэзкага абвастрэння міждзяржаўных адносін, да узнікнення ачагоў ваенных дзеянняў.

Репозиторий БрГУ

Трэба адзначыць, што кiраўнiкi Францыi i Вялiкабрытанii займалi пазiцыю “прымiрэння”, няўмяшання, каб адхiлiць ад сябе германскую агрэсiю i накiраваць яе на Усход – супраць СССР.

Мэтазгодна адзначыць, што Савецкi Саюз ў такiх абставiнах прымае шэраг крокаў: 16 лiстапада 1933 г. усталёўвае дыпламатычныя адносiны з ЗША; былi адноўлены дыпламатычныя адносiны з Чэхаславакiяй, Румынiяй, Венгрыяй, Балгарыяй, Бельгiяй i iншымi краiнамi. У маi 1935 г. памiж СССР i Францыяй, памiж Чэхаславакiяй i СССР былi падпiсаны дамовы аб узаемадапамозе на выпадак агрэсii.

Разглядаючы праблему стварэння сiстэмы калектыўнай бяспекi ў Еўропе, трэба адзначыць, што ў савецкай знешняй палiтыцы мелiся негатыўныя тэндэнцыi i заходнiя дзяржавы не праяўлялi неабходнай зацiкаўленасцi ў стварэннi сiстэмы калектыўнай бяспекi. Так, высновы УКП (б) i Камiнтэрна аб непазбежнасцi крушэння капiталiзму i перамозе сусветнай сацыялiстычнай рэвалюцыi успрымалiся заходнiмi краiнамi як спроба СССР навязаць камунiстычныя iдэалы.

Мюнхенскае пагадненне.

У 1938 г. Германiя выставiла патрабаванне да Чэхаславакii аб перадачы ёй Судэцкай вобласцi, на тэрыторыi якой пражывала нямецкая нацыянальная меншасць (напярэдаднi Мюнхенскага пагаднення насельнiцтва Чэхаславакii склала 14 млн. чалавек, ў тым лiку 3. 3 млн. этнiчных немцаў). Склалася вельмi напружанае становiшча. Пазiцыя кiраўнiкоў Францыi i Англi паказала, што яны не збiраюцца ваяваць за Чэхаславакiю. Савецкае кiраўнiцтва гатова было аказаць Чэхаславакii аднабаковую дапамогу, але прэзiдэнт Чэхаславакii Бенеш адмовiўся ад ваеннай дапамогi СССР.

29-30 верасня 1939 г. адбылася Мюнхенская канферэнцыя кiраўнiкоў урад Велiкабрытанii (Н. Чэмберлен), Францыi (Э. Даладзье), Германii (А. Гiтлер), Iталii (Б. Мусалiнi). Падпiсанае пагадненне рачлянiла Чэхаславакiю, якая страцiла 1/5 тэрыторыi i каля 5 млн. чалавек насельнiцтва (чэшскiя вобласцi Багемiя i Маравiя сталi германскiм пратэктаратам, ў Славакii быў створаны марыянетачны прафашысцi ўрад). Варта звярнуць увагу, што Мюнхенскае пагадненне гэта працяг палiтыкi “умиротворения”, чарговы крок на шляху развязвання Другой сусветнай вайны.

17 красавiка 1939 г. Савецкi Саюз прапанаваў Францыi i Велiкабрытанii падпiсаць сумесны дагавор на 5–10 гадоў аб узаемадапамозе ў выпадку агрэсii ў Еўропе супраць любой з дзяржаў, якiя дамаўлялiся. Англа-французскiя прапановы не ўтрымлiвалi абавязацельстваў дапамагаць СССР ў выпадку нападу Германii (гарантыi Францыя i Велiкабрытаня давалi толькi Румынii i Польшчы).

Рэпазiторый БрГУ

Трохбаковыя перагаворы ў Маскве з 15 чэрвеня па 2 жніўня 1939 г. аб стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі (адбылося 12 пасяджэнняў) станоўчыў вынікаў не далі. З 12 па 21 жніўня 1939 г. ў Маскве адбыдіся перагаворы ваенных місій трох краін. Б.М. Шапашнікаў (начальнік Генштаба Чырвонай Арміі) заявіў аб гатоўнасці СССР выставіць супраць агрэсара 136 дывізій, 5 тыс. гармат, каля 10 тыс. танкаў, 5,5 тыс. самалётаў. Аднак перагаворы зайшлі ў тупік.

У жніўні 1939 г. становішча ў Еўропе дасягнула найвышэйшаага напружання. Савецка-англа-французскія перагаворы зайшлі ў тупік. Германія распрацавала план нападу на Польшчу. 20 жніўня 1939 года. А. Гітлер даслаў тэлеграму І. Сталіну аб заключэнні дагавора аб ненападзе.

23 жніўня 1939 г. ў Маскве быў падпісаны германа-савецкі дагавор аб ненападзе – Пакт Рыбентропа-Молатава. Дагавор заключаўся на 10 гадоў. Дзве стараны бралі абавязак:

– устрымліавацца ад агрэсіўных дзеянняў і ад нападзення адзін на другога;

– кансультавацца па пытаннях, якія закранаюць агульныя інтарэсы;

– узнікшыя спрэчкі вырашаць мірным шляхам.

Трэба звярнуць увагу студэнтаў, што з юрыдычнага пункту погляду дагавор не выходзіў за рамкі прынятых ў той час пагадненняў, не парушаў заканадаўства і міжнародных абавязкаў СССР.

Што даў дагавор СССР?:

– да чэрвеня 1941 г. было сфарміравана 125 новых дывізій, праведзена частковая рэарганізацыя арміі;

– пашырылася ваенная вытворчасць;

– палепшылася стратэгічнае становішча краіны (заходнія межы былі аддалены на 250-300 км);

Што выіграла Германія?:

– да чэрвеня 1941 г. вермахт акупіраваў амаль усю кантынентальную Еўропу;

– у ходзе ваенных кампаній 1939–1941 гг. вермахт накапіў вопыт вядзення сучаснай вайны;

– Германія значна павялічыла ўзброенныя сілы:

| | 1940 г. | 1941 г. |
|---|---|---|
| войска | 3750 тыс. | 7234 тыс. |
| танкі | 3200 | 5640 |
| самалеты | 4405 | 10 тыс. |

Неабходна адзначыць, што савецка-германскі дагавор нанёс удар па міжнароднаму прэстыжу СССР, з Парыжа быў адазваны савецкі пасол, Савецкі Саюз парваў дыпламатычныя адносіны з урадамі акупіраваных Германіяй краін, падпісваліся сумесныя савецка-германскія заявы,

Рэпазіторый БрДУ

ажыццяўлялася абслугоўванне нямецкіх ваеных караблей ў савецкіх партах ў басейне Баранцавага мора. Дагавор стварыў цяжкасці ў міравым рабочым і камуністычным руху. У кампартыях многіх краін адбыўся раскол, затармазіўся працэс зараджэння руху Супраціўлення.

Важна звярнуць увагу студэнтаў на "Дагавор аб сяброўстве і межах" паміж СССР і Германіяй ад 28 верасня 1939 года. Мяжой размежавання паміж СССР і Германіяй была лінія Керзана – усходняя граніца Польшчы. Заключэнне гэтага дагавора – гэта палітычны пралік савецкага кіраўніцтва. У свядомасці савецкіх людзей, фашызм – класавы вораг і раптам сяброўства. Ідэя разграніўчэння сферы ўплыву паміж СССР і Германіяй – гэта скажэнне прынцыпаў і норм міжнароднага права. У сакрэтных пратаколах ігнараваўся суверэнітэт Прыбалтыйскіх дзяржаў. Генштаб Чырвонай Арміі пачаў распрацоўваць планы ўвода савецкіх войск у Прыбалтыйскія краіны (Эстонію, Латвію, Літву).

## Т э м а 2. **ПАЧАТАК ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І ПАДЗЕІ Ў БЕЛАРУСІ**

Прыступаючы да вывучэння гэтай тэмы вылучым вузлавыя пытанні:

1. Пачатак Другой сусветнай вайны. Паход войск Чырвонай Арміі ў Заходнія вобласці Беларусі і Украіны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.
2. Савецка-фінская вайна. СССР і краіны Балтыі.

Разглядаючы першае пытанне, трэба адзначыць, што запраграмаванасць на рэалізацыю ідэі сусветнага панавання германскай нацыі надштурхоўвалі А. Гітлера да прыняцця небяспечных рашэнняў (31 жніўня 1919 г. ён падпісаў дырэктыву аб нападзе на Польшчу).

1 верасня 1939 г. нямецкія войскі (57 дывізій) па плану "Вайс" ("Белы") уварваліся на тэрыторыю Польшчы. Плбшча выствіла 33 дывізіі. 3 верасня 1939 г. Велікабрытанія і Францыя аб'явілі вайну Германіі (з аб'яўленнем вайны Германіі выступілі Аўстралія, Новая Зеландыя, Канада, Індыя, Паўднёва-Афрыканскі Саюз). Вайна набыла сусветны характар (ў яе было ўцянута 61 дзяржава, ваенныя дзеянні адбываліся на тэрыторыі 40 дзяржаў).

Трэба звярнуць увагу студэнтаў на пяць асноўных перыядаў Другой сусветнай вайны:

<u>Першы перыяд</u> (1 верасня 1939 г. – 21 чэрвеня 1941 г.) пачатак Другой сусветнай вайны і захоп германскімі войскамі краін Заходняй Еўропы;

<u>Другі перыяд</u> (22 чэрвеня 1941 г. – 18 лістапада 1942 г.) – напад Германіі на СССР, пашырэнне маштабаў вайны.

Рэпазіторый БрГУ

Трэці перыяд (19 лістапада 1942 г. – 31 снежня 1943 г.) – карэнны пералом ў вайне, пераход стратэгічнай ініцыятывы да краін антыгітлераўскай кааліцыі.

Чацвёрты перыяд (1 студзеня 1944 г. – 8 мая 1945 г.) - разгром фашысцкага блока, заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны. Вызваленне ад германскай акупацыі краін Еўропы. Капітуляцыя Германіі.

Пяты перыяд (9 мая 1945 г. – 2 верасня 1945 г.) – разгром Японіі і заканчэнне Другой сусветнай вайны.

У выніку нямецкай агрэсіі большая частка Польшчы да 16 верасня 1939 г. была акупіравана (27 верасня 1939 г. нямецкія войскі захапілі Варшаву). Польскія войскі панеслі страты (каля 65 тысяч было забіта, 140 тыс. паранена, ў палон да немцаў трапіла каля 400 тыс. польскіх салдат і афіцэраў). Нямецкія войскі страцілі 16,4 тысяч забітых і 27,6 тысяч параненых.

Трэба адзначыць, што ў час нямецкай агрэсіі супраць Польшчы удар войск Францыі і Англіі (110 французскіх і 5 англійскіх дывізій) мог карэнным чынам змяніць ваеннае становішча. Але гэтага не адбылося. Кіраўнікі Францыі і Велікабрытаніі надзеяліся на далейшую нямецкую агрэсію на Усход.

16 верасня 1939 г. польскі урад эміграваў ў Румынію (потым ў Лондан). Савецкае кіраўніцтва перайшо да актыўных ваенных дзеянняў (былі створаны Беларускі і Украінскі франты).

З Польшчай СССР меў дагавор аб ненападзе (1932 г.). Стан вайны паміж СССР і Польшчай не быў аб'яўлены. 17 верасня 1939 г. войскі Чырвонай Арміі ўступілі на тэрыторыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны Паход Чырвонай Арміі працягваўся 12 дзён. Савецкія войскі занялі тэрыторыю прыкладна 190 тыс. кв.км з насельнітвам каля 12 млн. чалавек.

Трэба абавязкова звярнуць увагу на стварэнне арганаў новай улады: ў гарадах гэта – часовае кіраванне, а ў сельскай мясцовасці – сялянскія камітэты. Для вырашэння пытанняў аб дзяржаўным будаўніцтве ў г. Беластоку з 28–30 кастрычніка 1939 г. адбыўся Народны сход Заходняй Беларусі (прысутнічала 926 дэлегатаў). Народны сход прыняў наступныя дэкларацыі: аб дзяржаўнай уладзе; аб уваходзе З. Беларусі ў склад БССР; аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель; аб нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці.

2 лістапада 1939 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў закон “Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР з уз'яднаннем яе з БССР”. Вярхоўны Савет БССР 12 лістапада 1939 г. прыняў закон “Аб прыняцці Заходняй Беларуі ў склад БССР” (ў склад БССР увайшла тэрыторыя

Рэпазіторый БрДУ

плошчай 100 тыс. кв. км. з насельніцтвам 4,7 млн. чалавек). Былі ўтвораны новыя вобласі – Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская, Пінская.

Разглядаючы гэтае пытанне заўважым, што паміж урадамі СССР і Літоўскай рэспублікай быў падпісаны 10 кастрычніка 1939 г. дагавор аб перадачы Літве Віленскай вобласі (6900 кв.км). У вырашэнні гэтага пытання былі палітычныя меркаванні Масквы.

Далей мэтазгодна прасачыць супярэчлівы характар палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця ў З. Беларусі да чэрвеня 1941 г.

Вывучэнне пытання "Савецка-фінская вайна" мэтазгодна пачаць з разгляду патрабаванняў Савецкага Саюза, якія былі адхілены урадам Фінляндыі. Трэба заўважыць, што паміж СССР і Фінляндыяй ў 1932 г. быў заключаны пакт аб ненападзе. З кастрычніка 1938 г., па кастрычнік 1939 г. паміж СССР і Фінляндыяй вяліся перагаворы. Савецкі Саюз выставіў патрабаванні:

– дазвол Савецкаму Саюзу арэндаваць паўвостраў Ханка і размяшчэння на ім ваенна-марской базы;

– перадаць СССР пяць астравоў ў Фінскім заліве;

– перадаць Савецкаму Саюзу усходнюю частку паўвостраваРыбачы;

– на Карэльскім перашэйку перанесці граніцу на захад на 20-25 км;

– заключыць з СССР дагавор аб узаемадапамозе і супрацоўніцтве.

Трэба адзначыць, што СССР прапанаваў за частку фінскай тэрыторыі плошчай 2761 кв.км. аддаць 5567 кв.км, ва Усходняй Карэліі. Перагаворы не далі станоўчых вынікаў. 30 лістапада 1939 г. без аб'яўлення вайны часці Чырвонай Арміі перайшлі савецка-фінскую граніцу. Савецка-фінская вайна працягвалася 105 дзён. Не закранаючы дэталёвага характару баявых дзеянняў, мэтазгодна сканцэнтравць увагу на ваенна-палітычных выніках гэтай вайны.

Людскія і матэрыяльныя страты Фінляндыі і СССР.

| Страты | Фінляндыя | СССР |
|---|---|---|
| Забіта і прапала без вестак | каля 23 тыс. | звыш 140 тыс. |
| Паранена | 43557 | 264908 |
| Самалёты | 62 | 406 |
| Танкі | 50 | 653 |
| Гарматы і мінаметы | 500 | 422 |

Вайна паказала згубнасць сістэмы баявой падрыхтоўкі Чырвонай Арміі, асабліва цеснага ўзаемадзеяння радоў войск.

Репозиторий БрГУ

## Т э м а 3. **АКУПАЦЫЯ ГЕРМАНІЯЙ КРАІН ЕЎРОПЫ**

Разгляд гэтага пытання мэтазгодна пачаць з аналізу "дзіўнай вайны". Пасля акупацыі Польшчы, ваенныя дзеянні нямецкіх войск супраць Францыі і Вялікабрытаніі былі прыпынены да вясны 1940 г. Гэты перыяд атрымаў назву "дзіўная вайна". У чым яе сутнасць?:

– бяздзеянне англа-французскіх і нямецкіх войск на працягу 8 месяцаў;

– спроба заходнееўрапейскіх краін (асабліва Францыі і Вялікабрытаніі) накіраваць германскую агрэсію супраць Савецкага Саюза і падштурхнуць да вайны з СССР Турцыю, Фінляндыю, Нарвегію;

– германскае кіраўніцтва выкарыстала гэты час для прывядзення ў гатоўнасць узброенных сіл і выпуску неабходнай колькасці ваеннай тэхнікі і баепрпасаў.

Трэба адзначыць, што на Заходнім фронце нямецкім войскам (136 дывізій) супрацьстаялі ваенныя сілы Францыі 105 дывізій, а таксама 22 дывізіі бельгійскай арміі, 11-галандскай, 10- англійскай.

Далей варта звярнуць увагу студэнтаў на хроніку ваенных падзей 1940–1941 гг:

– 9 красавіка 1940 г. была захоплена Данія;

– 10 мая 1940 г. нямецкія войскі ўварваліся ў Бельгію (28 мая амаль 500 тыс. армія Бельгіі склала зброю);

– 14 мая 1940 г. капітуліравала галандская армія;

– 8 чэрвеня 1940 г. капітуліравала Нарвегія.

14 чэрвеня 1940 г. нямецкія войскі без боя захапілі Парыж. 22 чэрвеня 1940 г. урад А.Ф. Петэна падпісаў капітуляцыю Францыі (французская армія скарачалася да 100 тыс., паўднёвая частка Францыі заставалася пад уладай Петэна, Італіі аддавалася частка паўднёва-ўсходняй Францыі).

Бітва за Англію. А. Гітлер зацвердзіў дырэктыву № 16 – ажыццяўленне 17 ліпеня 1940 г. ваеннай аперацыі "Марскі леў". 13 нямецкіх дывізій (260 тыс. чалавек) павінны былі праз праліў Ла-Манш уварвацца на тэрыторыю Вялікабрытаніі. На працягу лета 1940 г. германская авіяцыя ажыццяўляла бамбардзіроўкі Вялікабрытаніі (з ліпеня па кастрычнік 1940 г. англійская авіяцыя страціла 915 знішчальнікаў, нямецкая – 1733 самалёта). 14 верасня 1940 г. Гітлер прыняў рашэнне адкласці аперацыю "Марскі леў".

У кастрычніку 1940 г. нямецкія войскі уступілі ў Румынію, нацысты падпарадкавалі Венгрыю, ў сакавіку 1941 г. увялі войскі ў Балгарыю, ў красавіку 1941 г. нямецкія і італьянскія войскі акупіравалі Югаславію і Грэцыю. Такім чынам, большасць еўрапейскіх краін аказаліся пад нямецка-фашысцкай акупацыяй.

Рэпазіторый БрГУ

## Т э м а 4. **СССР НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ**

Разглядаючы гэтае пытанне важна засяродзіць увагу на мерапрыемствах савецкага ўрада па ўмацаванні абароназдольнасці краіны:

– увядзенне ў эксплуатацыю новых прадпрыемстваў адбылося на ўсходзе краіны (Паволжа. Урал, Сібір, Казахстан). Балі створаны буйныя металургічныя камбінаты (Магнітагорскі, Кузнецкі, Новатагільскі);

– распрацаваны новыя вугальныя басейны ў Сібіры і на Урале, асвоены Волга-Уральскі нафтавы раён, уведзены ў эксплуатацыю нікелевыя камбінаты на Кольскім паўвостраве, Паўднёвым Урале, алюміневы завод на Урале, свінцовыя заводы ў Казахстане. У перадваенныя гады ў СССР было ўведзена ў эксплуатацыю звыш 9 тыс. заводаў, фабрык, шахтаў.

Трэба адзначыць, што на патрэбы абароны ў 1940 г. было выдаткавана 32,6 % (57 млрд.руб.) дзяржаўнага бюджэту (у 1938 г. – 23 млрд. руб).

У 1939–1940 гг. адбылася частковая мадэрнізацыя і пераўзбраенне арміі і флоту:

– ў ліпені 1940 г. былі прыняты на ўзбраенне самалёты МіГ–1, МіГ–3, Як–1, Як–4, Іл–2 і інш.;

– танкі Т–34, КВ былі прыняты на ўзброенне ў канцы1939 г. (іх серыйная вытворчасць пачалася ў другой палове 1940 г.);

– за 11 месяцаў 1940 г. флот атрымаў 100 новых баявых караблёў, 269 караблёў будаваліся.

За 1939 г – першую палову 1941 г. савецкая прамысловасць выпусціла больш чым 17 тыс. баявых самалётаў, 7 тыс. танкаў, больш чым 80 тыс. гармат і мінамётаў, 200 тыс. кулямётаў і аўтаматаў.Аднак новыя ўзоры баявой тэхнікі і ўзбраення толькі пачыналі паступаць ў Чырвоную Армію.

Кіраўніцтва СССР засяродзіла ўвагу на ўмацаванне узброенных сіл. 1 верасня 1939 г. ў СССР уводзілася ўсеагульная вайсковая павіннасць, прызыўны ўзрост зніжаўся з 21 да 19 гадоў. Чырвоная Армія пераводзілася на кадравую сістэму камплектавання (да чэрвеня 1941 г. колькасць асабовага складу Чырвонай Арміі дасягнула 5200 тыс. чалавек.)

Былі распрацаваны мерапрыемствы па ўмацаванні дысцыпліны на прадпрыемствах. З чэрвеня 1940 г. працоўныя пераходзілі на 8-гадзінны рабочы дзень і 7-дзённы рабочы тыдзень, быў забаронены самавольны пераход з аднаго прадпрыемства на другое. Указам Вярхоўнага Савета СССР ад 2.10. 1940 г. “Аб дзяржаўных працоўных рэзервах” былі створаны школы фабрычна-завадскога навучання і рамесныя вучылішчы, якія штогод рыхтавалі да 1 млн. рабочых (дзяржаўны рэзерв працоўнай сілы).

Рэпазіторый БрДУ

Далей трэба звярнуць увагу на ваенна-патрыятычную, абаронча-масавую і фізічную падрыхтоўку моладзі. Гэтую работу ажыццяўлялі УЛКСМ, розныя клубы, дабраахвотныя абарончыя аб'яднанні. За 1939–1940 гг. ў Беларусі было падрыхтавана 6350 кулямётчыкаў, 500 снайпераў.

Заходняя Асобая ваенная акруга.

## Т э м а 5. **ПАЧАТАК ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ**

Прыступаючы да вывучэння гэтай тэмы вылучым вузлавыя пытанні:

1. Ваенна-палітычныя і эканамічныя мэты Германіі ў вайне супраць Савецкага Саюза. Абарончыя баі Чырвонай Арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г.

2. Дзейнасць савецкіх і партыйных органаў Беларусі па мабілізацыі сіл і сродкаў для барацьбы з агрэсарам.

3. Прычыны паражэнняў Чырвонай Арміі летам-восенню 1941 г.

4. Ваенна-эканамічнае супрацоўніцтва СССР з Велікабрытаніяй і ЗША. Утварэнне антыгітлераўскай кааліцыі.

Прыступаючы да разгляду першага пытання нагадаем, што А. Гітлер 18 снежня 1940 г. падпісаў дырэктыву № 21 (план “Барбароса”). Ваенны план вермахта:

– галоўны ўдар наносіла група армій “Цэнтр”(разгром савецкіх войск ў Беларусі і захоп Масквы);

– група армій “Поўнач” павінна была разграміць савецкія войскі ў Прыбалтыцы і захапіць Ленінград;

– задача групы армій “Поўдзень” – захоп Кіева, авалодаць Данецкім басейнам.

Да 1 кастрычніка 1941 г. нямецкія войскі павінны былі завершыць баявыя дзеянні і выйсці на рубеж Архангельск – Волга. Галоўная палітычная мэта вайны Германіі супраць Савецкага Саюза – ліквідацыя савецкага дзяржаўна-грамадскага ладу і знішчэнне партыі бальшавікоў. Праграма асваення еўрапейскай часткі СССР была выкладзена ў дакуменце “Генеральны план Ост”, які прадугледжваў не толькі эксплуатацыю нацыянальных багаццяў СССР, але і знішчэнне мільёнаў савецкіх людзей, а “..усход да Урала павінен стаць пітомнікам германскай расы”.

Разглядаючы ваенныя дзеянні летам 1941 г. найперш трэба паказаць суадносіны ваенных сіл Германіі і СССР. У чэрвені 1941 г. вермахт меў 214 дывізій, СССР – 303 дывізіі.

У адпаведнасці з планам “Барбароса” Германія выставіла супраць СССР 153 дывізіі. Яе саюзнікі: Італія, Румынія. Фінляндыя, Венгрыя выставілі 37 дывізій (усяго 5.5 млн. чалавек, 47,2 тыс. гармат і мінамётаў, каля 4300 танкаў, 4980 баявых самалётаў). Савецкі Саюз ў 5 заходніх

Рэпазіторый БДТУ

акругах меў 170 дывізій (2,9млн.чалавек), 37,5 тыс. гармат і мінамётаў, 1457 новых танкаў, 1540 баявых самалётаў новага тыпу.

Суадносіны нямецкіх і савецкіх войск на асноўных накірунках

| | Група “Поўнач” | Прыбалтыйская асобая ваенная акруга |
|---|---|---|
| асабовы склад | 787 500 | 375 863 |
| гарматы і мінамёты | 8 348 | 7 467 |
| танкі | 679 | 1 514 |
| самалёты | 830 | 1 814 |

| | Група “Цэнтр” | Заходняя асобая ваенная акруга |
|---|---|---|
| асабовы склад | 820 000 | 680 000 |
| гарматы і мінамёты | 15 161 | 15 000 |
| танкі | 2 156 | каля 3 000 |
| самалёты | 1 670 | 1 939 |

| | Група “Поўдзень” | Кіеўская і Адэская ваенныя акругі |
|---|---|---|
| асабовы склад | 1 508 500 | 1 412 200 |
| гарматы і мінамёты | 16 008 | 26 580 |
| танкі | 1 144 | 8 069 |
| самалёты | 1 223 | 2 263 |

Мэтазгодна, таксама паказаць суадносіны ўзброеных сіл Заходняй Асобай ваеннай акругі і групы армій “Цэнтр”:

| | Асабовы склад | танкі | баявыя самалёты | гарматы і мінаметы |
|---|---|---|---|---|
| Заходняя Асобая Ваенная акруга | 672000 | 10087 | 2502 | 1909 |
| Група армій “Цэнтр” | 820000 | 10763 | 1177 | 1468 |

1941 г. адзначаны буйнымі поспехамі нямецкіх войск:

– у раёне Беластока і Мінска нямецкія войскі захапілі ў палон 328898 савецкіх салдат і афіцэраў, 3332 танкі, 1809 гармат;

– у канцы лета – пачатку восені 1941 г. ў раёне Кіева немцы захапілі ў палон амаль 665 тыс. савецкіх салдат і афіцэраў;

– у восень 1941 г. пад Бранскам і Вязьмай Чырвоная Армія страціла палоннымі 663 тыс. чалавек;

– з 22 чэрвеня па 21 снежня 1941 г. Чырвоная Армія страціла забітымі і параненымі 3158 тыс. чалавек. У ходзе абарончых баеў на

Репозиторий БрГУ

тэрыторыі Беларусі Чырвоная Армія страціла 1,5 млн.чалавек (немцы – забітымі і параненымі страцілі 150 тыс. чалавек).

Неабходна звярнуць увагу студэнтаў, что Чырвоная Армія не была разбіта, а яе часці мужна і гераічна вялі баі з захопнікамі на беларускай зямлі:

– з 22 чэрвеня 1941 г. гарнізон Брэсцкай крэпасці (каля 4 тыс. чалавек) амаль месяц вёў барацьбу. Абаронай крэпасці кіравалі капітан У.М. Зубачоў, маёр П.М. Гаўрылаў, капітан У.В. Шаблоўскі, лейтэнант А.М. Кіжэватаў, палкавы камісар Я.М. Фамін і інш. (указам Прэзідыўма ВС СССР 8 мая 1965 г. Брэсцкай крэпасці прысвоена ганаровае званне “Крэпасць-герой”);

– на паўночным захадзе ад Гродна 3-я пагранзастава лейтэнанта В.М. Усава 10 гадзін адбівала атакі ворага;

– мужна абаранялі г. Мінск байцы дывізіі генерал-маёра У.М. Русіянава (28 чэрвеня 1941 г. немцы захапілі г. Мінск);

– пад Барысавам (баі працягваліся 3 дні) немцы страцілі каля 70 танкаў і звыш 2 тыс. салдат і афіцэраў;

– з 3 па 26 ліпеня 1941 г. – гераічная абарона Магілёва (непасрэдную абарону трымала стралковая дывізія генерал-маёра М.Ц. Раманава);

– 20 дзён шлі баі пад Гомелем (страты немцаў склалі амаль 80 тыс. чалавек, каля 200 танкаў і 100 самалетаў), 20 жніўня 1941 г. немцы захапілі г. Гомель. Да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя Беларусі была акупіравана нямецкімі вайскамі.

Вывучэнне пытання “Дзейнасць савецкіх і партыйных органаў Беларусі па мабілізацыі сіл і сродкаў для барацьбы з агрэсарам” мэтазгодна засярэдзіць увагу студэнтаў на стварэнні 30 чэрвеня 1941 г. Дзяржаўнага Камітэта абароны (ДКА), які ўзначаліў І. Сталін (ДКА дзейнічаў да 4 верасня 1945 г.). У склад ДКА ўвайшлі Молатаў, Кагановіч, Маленкоў, Берыя, ў 1942 г. – Вазнясенскі, Кагановіч, Мікаян. ДКА вырашаў пытанні пераводу эканомікі на ваенны лад, ажыццяўляў мабілізацыю людскіх і матэрыяльных рэсурсаў краіны, падрыхтоўку рэзерваў і кадраў для Чырвонай Арміі, арганізаваў эвакуацыю прадпрыемстваў ў глыб краіны.

10 ліпеня 1941 г. ствараецца Стаўка Вярхоўнага камандавання (кіраўнік І. Сталін). 24 чэрвеня 1941 г. ствараецца Савет па эвакуацыі пры СНК СССР (старшыня Швернік).

Далей трэба адзначыць, што ў сваёй дзйнасці савецкія і партыйныя органы Беларусі кіраваліся Дырэктывай ЦК УКП(б) і СНК СССР ад 29 чэрвеня 1941 г. Важна засяродзіць увагу на мабілізацыю грамадзян ў дзеючую армію:

– арганізавана прайшла мабілізацыя ў Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Палескай абласцях (было мабілізавана амаль 500 тыс.

Репозиторий БрГУ

чалавек); за гады вайны ў СССР было мабілізавана амаль 30 млн. чалавек, з Беларусі – 1300 тыс.;

– на фронт было мабілізавана 26.5 тыс. камуністаў Беларусі (больш 1/3 КП(б)Б);

– для барацьбы з дыверсійнымі групамі ворага ў СССР было створана 1755 знішчальных батальёнаў (летам 1941 г. ў Беларусі было створана 78 знішчальных батальёнаў з лікам 13 тыс. чалавек);

– народнае апалчэнне СССР склала 60 дывізій (падраздзяленні апалчэнцаў Беларусі налічвалі больш 33 тыс. чалавек);

– Савет па эвакуацыі за ліпень-снежань 1941 г. ажыццявіў эвакуацыю на Усход 2593 прамысловыя прадпрыемствы (з Беларусі было эвакуіравана 124 прадпрыемства і каля 1,5 млн. чалавек).

Рэспубліка перадала Заходняму фронту 20 тыс. аўтамашын, 23 тыс. павозак, 36 тыс. каней, 20 тыс. тон прадуктаў харчавання.

Каля 2 млн. жыхароў рэспублікі было мабілізавана на будаўніцтва абарончых ліній. У раёне Магілёва штодзённа 10-15 тысяч чалавек працавала на будаўніцтве абарончых умацаванняў (за 7 дзён была створана 25 км. лінія абароны). Штодзённа на будаўніцтве абарончых ліній працавала 10 тыс. гамельчан. Заводы "Гомсельмаш", станкабудаўнічыя г. Віцебска, Магілёўскі трубаліцейны выраблялі гранаты, рамантавалі баявую тэхніку, зброю.

Сярод розных прычын паражэння Чырвонай Арміі ў 1941 г., мэтазгодна вызначыць асноўныя:

– прамысловы патэнцыял Германіі ў 1,5–2 раза перавышаў прамысловую базу СССР;

– Германія мела атмабілізаваную і меўшую двухгадовы вопыт вядзення вайны армію. Вермахт захапіў узбраенне 92 французскіх, 30 чэхаславацкіх, 2 бельгійскіх , 18 галандскіх, 12 англійскіх, 6 нарвежскіх дывізій. Чырвоная Армія знаходзілася ў стадыі пераўзбраення і рэарганізацыі;

– камандны састаў Чырвонай Арміі не валодаў добрымі практычнымі навыкамі кіравання вялікімі вайскавымі злучэннямі. Прычыны гэтага – рэпрэсіі 1937–1938 гг.

Варта звярнуць увагу, што з 5 савецкіх маршалаў было рэпрэсіравана 3, былі рэпрэсіраваны усе камандуючыя ваеннымі акругамі, з 5 каманармаў 1-га ранга – 3, з 10 камандармаў 2-га ранга – усе, з 57 камкараў – 50, з 168 кам.дывізій – 154, з 456 палкоўнікаў – 401. Усяго было рэпрэсіравана больш за 40 тыс. афіцэраў Чырвонай Арміі. 28 кастрычніка 1941 г. ў Куйбышаў вывязлі і растралялі гнералаў Лакціёнава, Рыгачова, Штэрна, Смушкевіча, Саўчанка. У студзені 1941 г. Гітлер ахарактарызаваў Чырвоную Армію як "гліняны колас без галавы".

Рэпазіторый БрДУ

Важна адзначыць ваенна-палітычны і стратэгічны празлік савецкага кіраўніцтва ў аналізу ваенна-стратэгічнага становішча і тэрміну пачатку вайны (адцягнуць вайну не удалося, Чырвоная Армія не была прывядзена ў баявую гатоўнасць, не адбылася мабілізацыя неабходных сродкаў для вядзення вайны). Галоўны напрамак ваенных дзеянняў савецкае кіраўніцтва памылкова вызначыла паўднева-заходні. Слабой была ваенна-тэхнічная і тактычная падрыхтоўка байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі. Нельга не адзначыць і некампетэнтнае ўмяшанне Сталіна ў кіраўніцтва ваеннымі аперацыямі, што ў значнай меры садзейнічала паражэнням савецкіх войск.

Разглядаючы "Ваенна-эканамічнае супрацоўніцтва СССР з Велікабрытаніяй і ЗША. Ваенныя дзеянні ў канцы 1941 г." варта звярнуць увагу на задачы савецкага кіраўніцтва ў знешнепалітычнай дзейнасці:

– забяспечыць належныя знешнія ўмовы для адпору ворагу;

– прадухіліць напад на СССР дзяржаў якія трымалі нейтралітэт;

– дапамогчы народам вызваліцца ад нямецкай акупацыі.

Далей трэба звярнуць ўвагу на ўтварэнне і пашырэнне антыгітлераўскай кааліцыі:

– 22 чэрвеня 1941 г. урад Англіі, а 24 чэрвеня ўрад ЗША заявілі, што будуць аказваць рускаму народу дапамогу ў вайне;

– 12 ліпеня 1941г. было падпісана пагадненне СССР і Англіі аб узаемадапамозе і незаключэнні сепаратнага міру з Германіяй;

– 2 жніўня 1941 г. урад ЗША прыняў рашэнне аб пастаўках у СССР узбраення, ваеных матэрыялаў, харчавання ў межах ленд-лізу (ЗША выдзялілі Савецкаму Саюзу крэдыт 1 млрд. дал.);

– 14 жніўня 1941 г. У. Чэрчыль і Ф. Рузвельт падпісалі Атлантычную хартыю, да якой далучыліся 10 краін;

– 29 верасня – 1 кастрычніка 1941 г. на Маскоўскай канферэнцыі трох краін – СССР, ЗША і Англія было прынята рашэнне аб англа-амерыканскіх ваеных пастаўках Савецкаму Саюзу;

– 1 студзеня 1942 г. прадстаўнікі 26 дзяржаў падпісалі ў Вашынгтоне Дэкларацыю Аб'яднаных Нацый . Было прынята рашэнне накіраваць ўсе сродкі на барацьбу з агрэсарамі і не заключаць сепаратнага міру з ворагам да поўнай перамогі.

Так утваралася антыгітлераўская кааліцыя. Калі ў жніўні 1940 г. дыплыматычныя адносіны з Германіяй падтрымлівалі 40 дзяржаў, то ў 1942 г. – 21 краіна. У 1945 г. антыгітлераўская кааліцыя налічвала 55 дзяржаў. Гістарычная справядлівасць патрабуе прызнаць, што рашаючая роля ў разгроме фашызма належыць Савецкаму Саюзу, што галоўныя сілы вермахта былі разгромлены на савецка-германскім фронце.

Репозиторий БрГУ

## Т э м а 6. **АКУПАЦЫЙНЫ РЭЖЫМ**

Пры разглядзе гэтай тэмы неабходна вылучыць наступныя асноўныя пытанні:

1. Планы фашысцкай Германіі ў дачыненні да акупіраваных тэрыторый.
2. Фашысцкі “новы парадак” і сродкі яго падтрымання.
3. Калабарацыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

1. Разгляд першага пытання патрэбна пачаць з таго, што яшчэ ў 1940 годзе нямецка-фашысцкае кіраўніцтва зацвердзіла план “Ост” (“Усход”), якім прадугледжвалася каланізацыя і германізацыя захопленай тэрыторыі СССР. Планавалася знішчыць ці прымусова выселіць 75% беларусаў, рускіх і ўкраінцаў, а астатнія 25% анямечыць і выкарыстаць у якасці рабочай сілы. Яўрэяў і цыганоў на акупіраванай тэрыторыі СССР чакала поўнае знішчэнне “Для нас, немцаў, – падкрэслівалася ў заключнай частцы плана “Ост”, – важна аслабіць рускі народ да такой ступені, каб ён больш не быў у стане перашкаджаць нам усталёўваць нямецкае панаванне ў Еўропе”. Дзеля рэалізацыі гэтага плана ў рэйху было створана спецыяльнае міністэрства па пытаннях усходніх тэрыторый начале з А. Розенбергам.

План “Ост” таксама прадугледжваў “гаспадарчае выкарыстанне СССР у інтарэсах эканомікі Германіі”. За выкананне гэтых задач адказвала спецыяльная арганізацыя пад кодавай назвай “Ольдэн”, якая дзейнічала як эканамічны штаб па рэалізацыі плана “Ост”. Галоўныя мэты і задачы германскай эканамічнай палітыкі былі адлюстраваны ў спецыяльных “дырэктывах”, якія змяшчаліся ў так званай “Зялёнай папцы”.

Увогуле планы фашысцкай Германіі ў дачыненні да акупіраванай тэрыторыі СССР і БССР уяўлялі сабой сістэму палітычных, эканамічных, ваенных і ідэалагічных мер, накіраваных на ліквідацыю савецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу, рабаванне нацыянальных багаццяў і рэсурсаў, заняволенне і знішчэнне славянскіх і іншых народаў.

2. Свой акупацыйны рэжым нямецка-фашысцкія захопнікі называлі “новым парадкам”. Яго ідэйнай асновай была чалавеканенавісніцкая “расавая тэорыя” нацыстаў, якая сцвярджала перавагу арыйскай расы над усімі іншымі народамі, яе права на сусветнае панаванне і неабходнасць пашырэння жыццёвай прасторы для немцаў.

Неабходна падкрэсліць, што асновай падтрымання “новага парадку” былі войскі і розныя спецслужбы: СС (ахоўныя атрады і адборныя войскі), СА (штурмавыя атрады), СД (служба бяспекі), гестапа (дзяржаўная тайная паліцыя), жандармерыя і іншыя.

Рэпазіторый БДПУ

Далей неабходна сказаць, што на акупіраванай частцы тэрыторыі СССР акупанты ажыццявілі новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Былі створаны два рэйхскамісарыяты: “Украіна” начале з Э. Кохам і “Остланд”, якім кіраваў Г.Лозе.

Тэрыторыя БССР была ўключана ў розныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі (інфармацыя аб гэтым шырока прадстаўлена ў навучальнай літаратуры). Акрамя таго былі створаны Генеральная акруга Беларусь (далей – ГАБ) у складзе 68 даваенных раёнаў рэспублікі. Вышэйшым выканаўчым органам ГАБ з’яўляўся генеральны камісарыят, які ўзначальваў гаўляйтэр В. Кубэ (пасля яго забойства – генерал СС К. Готберг). Яму і ваенна-паліцэйскаму кіраўніцтву належала ўся паўната ўлады на акупіраванай тэрыторыі. Гэтую ўладу В. Кубэ і яго паплечнікі выкарыстоўвалі дзеля ажыццяўлення палітыкі генацыду ў адносінах да беларусаў. Аб гэтым яскрава сведчаць наступныя факты: на тэрыторыі Беларусі было створана больш за 260 лагераў смерці, ў кожным раёне дзейнічалі канцлагеры, турмы, гета. Звычайнай практыкай стала спальванне карнікамі вёсак разам з іх жыхарамі. У прыватнасці, 22 сакавіка 1943 г. паблізу Лагойска карны паліцэйскі батальён спаліў вёску Хатынь. У агні загінула 149 чалавек, у тым ліку 76 дзяцей. Трагічны лёс Хатыні падзялілі 628 беларускіх вёсак, з якіх 186 так і не аднавіліся пасля вайны.

У адносінах да партызан і цывільнага насельніцтва фашысты правялі звыш 140 карных экспедыцый, пераўтварыўшы ў пустыні цэлыя раёны. Фашысты гвалтоўна выводзілі беларусаў, асабліва моладзь, на катаржныя работы ў Германію. Тых, хто ўхіляўся ад адпраўкі ў Германію, растрэльвалі. За час акупацыі з Беларусі было вывезена каля 380 тысяч чалавек, у тым ліку больш як 24 тысячы дзяцей.

У розных навучальных крыніцах прыводзяцца шматлікія факты злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на акупіраванай тэрыторыі БССР і СССР, з якімі можна самастойна азнаёміцца. Аднак адзін факт уражвае найбольш за ўсё: за перыяд акупацыі захопнікі знішчылі ў Беларусі больш за 2 млн. 200 тыс. чалавек, або кожнага чацвёртага жыхара нашай рэспублікі. А між іншым многія даследчыкі лічаць, што ахвяр фашысцкага генацыду было намнога больш.

У многіх войнах, праз якія прайшло чалавецтва, па ідэалагічных, палітычных і іншых прычынах да краіны-агрэсара нярэдка далучалася частка насельніцтва краіны, якая стала ахвярай агрэсіі. Такая з’ява атрымала назву калабарацыі (калабарацыянізму). Не абышла гэтая з’ява СССР і нашу рэспубліку ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Частка жыхароў Беларусі пачала супрацоўнічаць з нямецкімі адміністрацыйнымі структурамі, а то і служыць у карных войсках. Значную частку

Рэпазіторый БрГУ

калабарантаў складалі беларусы якія былі пакрыўджаны бальшавіцка-савецкай уладай. Сярод іх былі і беларусы, якія раней пражывалі ў Заходняй Беларусі ў эміграцыі і якія спадзяваліся з дапамогай фашысцкай Германіі адрадзіць Беларусь у якасці незалежнай дзяржавы. Былі і тыя, хто трагічнымі абставінамі вайны былі пазбаўлены выбару ўласнага лёсу і насупраць сваім перакананням пачалі прыслужваць акупантам.

У сувязі з гэтым патрэбна назваць і ахарактарызаваць мэты і дзейнасць наступных калабаранцкіх арганізацый; Беларуская народная самадапамога (БНС), Беларускі корпус самаахновы (БКС), Саюз беларускай моладзі (СБМ), Беларуская цэнтральная Рада (БЦР), Беларуская краёвая абарона (БКА).

У цэлым дзейнасць усіх калабаранцкіх арганізацый, нягледзячы на дэкларыруемые імі ў шэрагу выпадкаў высакародныя мэты, была накіравана супраць інтарэсаў беларускага народа, дапамагала акупантам ажыццяўляць іх чалавеканенавісніцкую палітыку.

## ТЭМА 7. ПАРТЫЗАНСКАЯ І ПАДПОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА НА АКУПІРАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ.

Дадзеную тэму магчыма падзяліць на наступныя пытанні:
1. Партызанскі рух на акупіраванай тэрыторыі СССР і БССР.
2. Падпольная барацьба.
3. Рух Супраціўлення ў краінах Еўропы.

Разгляд першага пытання неабходна пачаць з указання прычын, якія абумовілі разгортванне партызанскага і падпольнага руху. Гэтыя прычыны відавочныя: непрыняцце народамі СССР і краін Еўропы палітычных і ваенна-эканамічных планаў акупантаў, а таксама жорсткі, антылюдскі нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым, які ўяўляў верх глумлення над чалавечай годнасцю.

Далей неабходна падкрэсліць, што вайна з германскім фашызмам палітычным кіраўніцтвам СССР была вызначана як “вялікая” і “айчынная”. Гэта азначала, што барацьба з ворагам – справа ўсіх народаў СССР і ўсіх слаёў насельніцтва. Таму састаўной часткай барацьбы з ворагам стала партызанская і падпольная барацьба на акупіраваных ім тэрыторыях. Ужо з першых дзён вайны арганізацыі гэтай барацьбы надавалася вялікая ўвага. У гэтай сувязі важнае значэнне мела дырэктыва Савета Народных Камісараў Саюза СССР і ЦК УКП (б) ад 29 чэрвеня 1941 г. “Партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей”, якая патрабавала стварэння партызанскіх атрадаў і дыверсійных груп для барацьбы з варожай арміяй. Для кіраўніцтва гэтай барацьбой прадугледжвалася

Репозиторий БрГУ

стварэнне падпольных ячэек і явачных кватэр у кожным горадзе, раённым цэнтры, рабочым пасёлку, чыгуначнай станцыі, калгасах і саўгасах.

У сваю чаргу ЦК КП (б) Б 1 ліпеня 1941 г. зацвердзіў дырэктыву партыйным, савецкім і камсамольскім арганізацыям Беларусі аб разгортванні партызанскай вайны ў тыле ворага. Яна падугледжвала пакрыць усю мясцовасць Беларусі, якая занята ворагам, густой сеткай партызанскіх атрадаў, а таксама стварыць у раёнах і вёсках падпольныя партыйныя і камсамольскія ячэйкі з мэтай мабілізацыі народа на бязлітасную барацьбу з ворагам.

Ужо напрыканцы 1941 г. у тыле ворага на акупіраванай тэрыторыі СССР дзейнічалі 2 тыс. партызанскіх атрадаў агульнай колькасцю 90 тыс. чалавек, у тым ліку ў Беларусі – каля 230 атрадаў і груп у складзе звыш 12 тыс. чалавек.

Асноўнай баявой адзінкай з'яўляўся партызанскі атрад. На тэрыторыі Беларусі ў першыя дні вайны быў сфарміраваны і ўступіў у бой з ворагам пінскі партызанскі атрад пад камандаваннем В. Каржа. У гэты час пачаў дзейнічаць атрад пад кіраўніцтвам Ц. Бумажкова і Ф. Паўлоўскага ў Кастрычніцкім раёне Палескай вобласці. Яны першымі з беларускіх партызан 6 жніўня 1941 г. атрымалі званне Героя Савецкага Саюза. У ліпені 1941 г. у Суражскім раёне Віцебскай вобласці быў створаны атрад, які ўзначальваў М. Шмыроў ("бацька Мінай"). За яго галаву вораг абяцаў карову і вялікую грашовую суму. Фашысты схапілі дзяцей партызанскага камандзіра, якіх прапанавалі абмяняць на яго галаву, але М. Шмыроў не пагадзіўся, і дзеці былі растраляны.

Рост партызанскага руху запатрабаваў удасканалення яго структуры і кіравання ім. Таму з вясны 1942 г. на аснове асобных партызанскіх атрадаў пачалі стварацца партызанскія брыгады. Першая брыгада – "гарнізон Ф.І. Паўлоўскага" – была створана на тэрыторыі Кастрычніцкага раёна Палескай вобласці ў студзені 1942 г. Для ўзмацнення аператыўнага кіраўніцтва і эфектыўнага выканання баявых задач з ліку партызанскіх брыгад і атрадаў ствараліся партызанскія злучэнні, якіх на тэрыторыі Беларусі налічвалася каля 40.

Для каардынацыі партызанскага руху 30 мая 1942 г. пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР) начале з першым сакратаром ЦК КП(б) Б П. Панамарэнкам. 3 верасня 1942 г. пачаў дзейнічаць Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР), які ўзначаліў другі сакратар ЦК КП(б) Б П. Калінін.

У розных крыніцах прыводзяцца шматлікія яскравыя прыклады гераічнай барацьбы савецкіх партызан, у тым ліку на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Важна падкрэсліць, што напрыканцы 1943 г.

Репозиторий БрГУ

партызаны кантралявалі больш за палову тэрыторыі Беларусі. Існавала звыш 20 партызанскіх зон.

Важнай формай партызанскай барацьбы з’яўляліся рэйды партызан, якія мелі на мэце пашырэнне ўзброенай барацьбы, дэзарганізацыю тылу ворага, знішчэнне яго гарнізонаў, ваенных аб’ектаў, паліцэйскіх участкаў, уздым маральнага духу цывільнага насельніцтва.

Вялікія страты ворагу нанесла “рэйкавая вайна” – разбурэнне чыгуначных камунікацый у тылу ворага. На тэрыторыі Беларусі яна прайшла ў тры этапы:

I этап – 3 жніўня – сярэдзіна верасня 1943 г.

II этап – 19 верасня – пачатак лістапада 1943 г. (кодавая назва этапа – “Канцэрт”).

III этап – пачаўся 20 чэрвеня 1944 г. за тры дні да аперацыі “Баграціён”.

Разглядаючы партызанскі рух неабходна назваць яго асаблівасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Тут дзейнічалі атрады польскай ваеннай арганізацыі “Армія Краёва” (АК). У сваёй барацьбе АК кіравалася тэорыяй аб двух ворагах Польшчы – фашысцкай Германіі і Савецкага Саюза. У Заходняй Беларусі таксама дзейнічала арганізацыя ўкраінскіх нацыялістаў (АУН), лідэрам якой быў Сцяпан Бандэра.

Падсумоўваючы вынікі партызанскай барацьбы, патрэбна адзначыць, што яна насіла ўсенародны характар, стала важным укладам у справу разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аб яе размаху сведчыць тое, што ў ёй на акупіраванай тэрыторыі СССР удзельнічала звыш 1 млн. чалавек, з якіх 374 тыс. складалі беларускія партызаны.

2. Састаўной часткай барацьбы ў тыле ворага побач з партызанскім рухам быў падпольны рух. Яго асноўнымі формамі з’яўляліся: ажыццяўленне дыверсій на ваенных і гаспадарчых аб’ектах, фізічнае знішчэнне фашысцкіх службовых асоб і здраднікаў, збор разведдадзеных, выданне баявых пракламацый і лістовак, збор зброі, правіянту і медыкаментаў для партызан, сувязная работа, правядзенне агітацыйнай работы сярод насельніцтва.

Прыкладам гераічнай і эфектыўнай барацьбы з ворагам з’яўляецца, у прыватнасці, Мінскае падполле. Яго арганізатарамі былі І. Кавалёў, І. Казінец, І. Матусевіч, І. Кабушкін і іншыя. Тройчы акупанты наносілі жорсткі ўдар па падполлю, аднак яно кожны раз аднаўлялася. Нездарма фашысты называлі Мінск “страляючым горадам”. За час акупацыі ў горадзе было праведзена звыш 15 тыс. дыверсій. Ноччу 22 верасня 1943 г. мінскія падпольшчыцы А. Мазанік, М. Осіпава і Н. Траян знішчылі гаўляйтэра Беларусі В. Кубэ. Мужная барацьба падпольшчыкаў Мінска з

Репозиторий БрГУ

ворагам стала адной з галоўных прычын прысваення яму ў 1974 г. ганаровага звання “Горад-герой”.

Мужна змагалася падполле Віцебска. Адным з яго арганізатараў была В. Харужая – актыўная ўдзельніца рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., калі яна была пад уладай Польшчы. У лістападзе 1942 г. яна была схоплена і закатавана фашыстамі. Пасмяротна В. Харужай было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Актыўную антыфашысцкую барацьбу вялі падпольшчыкі Оршы пад кіраўніцтвам К. Заслонава. Яны выраблялі падобныя пад кавалкі каменнага вуглю міны і падкідвалі іх у топкі паравозаў. Калі над К. Заслонавым і яго таварышамі навісла пагроза раскрыцця, яны пакінулі горад і падаліся ў лес, дзе К. Заслонаў узначаліў партызанскую брыгаду. Пасмяротна яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Шырокую вядомасць набылі подзвігі падпольнай камсамольскай арганізацыі “Юныя мсціўцы” на чыгуначнай станцыі Обаль на Віцебшчыне, антыфашысцкая барацьба падпольшчыкаў Магілёва, Брэста і іншых гарадоў. Аб усім гэтым можна даведацца ў розных крыніцах. Усяго ў перыяд акупацыі з ворагам змагаліся 74 тыс. беларускіх падпольшчыкаў.

3. Барацьба супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў вялася і ў краінах Еўропы, дзе яна атрымала назву рух Супраціўлення. Гэты рух уяўляў сукупнасць узброенай, эканамічнай і ідэалагічнай формаў барацьбы насельніцтва захопленых краін супраць германскага акупацыйнага рэжыму за свабоду і нацыянальна-дзяржаўную незалежнасць.

Найбольш дзейснымі формамі супраціўлення агрэсару былі партызанскі рух, падпольная барацьба, агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць, эканамічны сабатаж, невыкананне дырэктыўных указанняў і загадаў акупацыйных уладаў.

Падпольная антыфашысцкія групы існавалі нават у самой Германіі. Пасля вайны стала вядомай дзейнасць “Чырвонай капэлы” – антыфашысцкай арганізацыі, звязанай з савецкай разведкай.

З восені 1939 г. сталі ўзнікаць ачагі антыгерманскага супраціўлення ў Польшчы. Яно падтрымлівалася польскім урадам, які знаходзіўся ў эміграцыі ў Францыі, а з 1940 г. у Вялікабрытаніі.

Не скарыліся ворагу патрыёты Францыі. Сілы французскага руху Супраціўлення ў ліпені 1941 г. аб’ядналіся ў Нацыянальны фронт, мэтай якога было вызваленне Францыі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У маі 1943 г. была ўтворана Нацыянальная рада Супраціўлення, якая аб’яднала ўсе антыфашысцкія сілы Францыі. Надзвычай гераічна ў барацьбе з фашызмам праявіла сябе Французская камуністычная партыя, якую называлі “партыяй растраляных”, бо 25 тыс. французскіх камуністаў загінула ў барацьбе з ворагам.

Рэпазіторый БрДУ

Найбольш вялікі размах антыгерманскае Супраціўленне набыло ў Югаславіі. Тут былі сфарміравана Народна-вызваленчая армія Югаславіі пад кіраўніцтвам І.Б. Ціто, якая налічвала 320 чалавек. За час вайны загінула звыш 1,7 млн. югаслаўскіх патрыётаў.

Антыфашысцкая барацьба разгарнулася ў Албаніі, Бельгіі, Грэцыі, Даніі, Нарвегіі, Нідэрландах, Чэхаславакіі. Патрыятычная барацьба разгортвалася нават у тых краінах, дзе існавалі прагерманіскія ўрады: Італіі, Аўстрыі, Румыніі, Балгарыі, Харваціі, Фінляндыі, Венгрыі. Так, у цэнтры і на поўначы Італіі дзейнічалі гарыбальдзійскія брыгады.

У руху Супраціўлення ўдзельнічалі людзі розных сацыяльных слаёў і груп, нацыянальнасцей, веравызнанняў і палітычных поглядаў. У гэтым руху таксама ўдзельнічалі 40 тыс. савецкіх людзей.

Пашырэнню руху Супраціўлення паспрыяў карэнны перралом у ходзе вайны і роспуск Камінтэрна, праведзены па ўказанні І. Сталіна ў 1943 г. Доўгія гады Камінтэрн быў сімвалам сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі. Гэта стрымлівала наладжванне супрацоўніцтва паміж камуністамі і іншымі антыфашысцкімі сіламі ў акупіраваных краінах.

## Тэма 8. ПАДЗЕІ НА ФРАНТАХ ВАЙНЫ. КРУШЭННЕ НАСТУПАЛЬНАЙ СТРАТЭГІІ ГЕРМАНСКАГА ВЕРМАХТА.

Асвятленне тэмы вымагае разгляду наступных пытанняў:

1. Падзеі на франтах вайны зімой – вясной 1942 г.

2. Карэнны пералом у Вялікай Айчыннай вайне.

3. Ваенна палітычныя падзеі ў 1943 г. Умацаванне антыгітлераўскай кааліцыі.

1. Разгляд першага пытання мэтазгодна пачаць з таго, што пасля разгрому немцаў пад Масквой ваенна-палітычнае кіраўніцтва СССР на зіму – вясну 1942 г. паставіла задачу разграміць групу армій “Поўнач” і ліквідаваць блакаду Ленінграда, на заходнім напрамку – акружыць і разграміць пад Ржэвам і Вязьмай войскі групы армій “Цэнтр”, а на поўдні – вызваліць Данбас і Крым.

Аднак неабходных сіл, рэзерваў, зброі і боепрыпасаў для ажыццяўлення гэтых планаў не было. Таму агульнае наступленне Чырвонай Арміі скончылася няўдачай.

Бязлітасныя баі адбываліся пад Ржэвам. На захад ад Вязьмы вораг акружыў ударную групу 33-й арміі і адрэзаў яе ад асноўных сіл Заходняга фронта. За два месяцы баёў у акружэнні большая частка гэтай групы загінула.

Няўдачай скончылася спроба прарваць блакаду Ленінграда, што паставіла яго жыхароў у адчайнае становішча. Толькі з пачаткам зімы

Рэпазіторый БрДУ

1942 г. па ільду Ладажскага возера была пракладзена магістраль ("дарога жыцця"), па якой ленінградцы забяспечваліся харчаваннем і медыкаментамі. За час блакады загінула каля 650 тыс. ленінградцаў.

У пачатку мая 1942 г. ударныя групоўкі ворага пачалі наступленне ў Крыме. 19 мая яны захапілі Керч, а 4 ліпеня – Севастопаль. Крым быў поўнасцю акупіраваны.

Адначасова з наступленнем немцаў у Крыме савецкае камандаванне са свайго боку разгарнула наступленне на Харкаў, якое скончылася няўдачай. Савецкія дывізіі і палкі трапілі ў акружэнне, вырвацца з якога змаглі нямногія. Становішча на паўднёвым крыле савецка-германскага фронта змянілася на карысць вермахта.

Напрыканцы ліпеня 1942 г. войскі Германіі і яе сатэлітаў разгарнулі наступленне на Каўказ пад кодавай назвай "Эдельвейс". З захопам Каўказа вораг спадзяваўся паралізаваць базы Чарнаморскага флоту, захапіць бакінскія нафтавыя промыслы і ў далейшым выйсці на Блізкі Усход. Бітва за Каўказ доўжылася з 25 ліпеня 1942 г. па 9 кастрычніка 1943 г. і скончылася поўным разгромам ворага.

2. Разгляд другога пытання неабходна пачаць з указання на тое, што галоўнымі падзеямі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў сталі Сталінградская і Курская бітвы, якія забяспечылі карэнны пералом ў барацьбе з ворагам. Змест паняцця "карэнны пералом" характарызуецца пераходам стратэгічнай ініцыятывы ў рукі савецкага ваеннага камандавання, калі яно ўжо пачало навязваць ворагу стратэгію і ўмовы вядзення вайны.

Пачатак карэннаму пералому ў вайне паклала Сталінградская бітва. Сабраўшы вялікія сілы, фашысты рагранулі летам 1942 г. наступленне на поўдні, занялі ўсходнюю частку Украіны, увесь Данбас, вышлі ў выгіб Дона, прарваліся на Паўночны Каўказ. З 17 ліпеня 1942 г. пачалася Сталінградская бітва. Напярэдадні яе варожыя войскі параўзыходзілі сілы Чырвонай Арміі ў асабавым складзе ў 1,7 раза, артылерыі і танках – 1,3 раза, у самалётах – больш чым у 2 разы. Яна падзяляецца на два перыяды:

1. Абарончы перыяд (17 ліпеня – 18 лістапада 1942 г.).
2. Наступальны перыяд (19 лістапада 1942 г. – 2 лютага 1943 г.).

У абарончы перыяд войскі Чырвонай Арміі гераічна адбівалі магутныя ўдары ворага. Падчас летніх баёў 1942 г. на далёкіх подступах да Сталінграда быў выйграны час для арганізацыі надзейнай абароны горада. Умацаванню вайсковай дысцыпліны і баяздольнасці войскаў паспрыяў загад І. Сталіна № 227 ад 28 ліпеня 1942 г., больш вядомы як загад "Ні кроку назад".

Репозиторий БрГУ

Аднак у другой палове жніўня ворагу ўдалося фарсіраваць Дон, прарвацца да Волгі на поўнач ад Сталінграда і адрэзаць войскі, якія абаранялі горад, ад астатніх сіл фронту. У сувязі з гэтым у Сталінградзе было абвешчана асаднае становішча. З 13 верасня пачалі жорсткія баі ў Сталінградзе. У літаратуры можна знайсці шмат прыкладаў мужнасці і гераізму абаронцаў Сталінграда. Адным з іх з'яўляецца гераізм 24 байцоў начале з сяржантам Паўлавым, якія 58 дзён вялі баі ў адным з дамоў, пераўтварыўшы яго ў важны апорны пункт абароны горада.

У абарончых баях савецкія войскі нанеслі вялікія страты ворагу і стварылі ўмовы для пераходу ў контрнаступленне, якое пачалося 19 лістапада 1942 г. сіламі Паўднёва-Заходняга (камандуючы – Д. Ватуцін) і Данскога (камандуючы – К. Ракасоўскі) франтоў, а затым і Сталінградскага фронта (камандуючы – А. Яроменка). У выніку ў акружэнні апынуліся 22 варожыя дывізіі агульнай колькасцю 330 тыс. салдат і афіцэраў. 10 студзеня 1943 г. Чырвоная Армія прыступіла да ліквідацыі акружанай групоўкі варожых войск, якая завяршылася 2 лютага 1943 г. яе капітуляцыяй. У сувязі з катастрофай пад Сталінградам ў Германіі ўпершыню была аб'яўлена трохдзённая жалоба.

Завяршыла карэнны перелом у Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнах Курская бітва, якая працягвалася з 5 ліпеня па 23 жніўня 1943 г. Наступленне пачало фашысцкае камандаванне, якое разлічвала на рэванш за сваё паражэнне пад Сталінградам, а таксама імкнулася ўзняць маральны дух сваіх войскаў і ўтрымаць ад развалу фашысцкі блок. Пад Курсам германскае камандаванне сканцэнтравала 900 тыс. салдат і афіцэраў, каля 2 700 танкаў, 10 тыс. гармат і мінамётаў, больш 2 тыс. самалётаў. Вялікія надзеі яно ўскладала на новыя цяжкія танкі “Тыгр” і “Пантэра”, штурмавыя гарматы “Фердынанд”, самалёты “Фоке-Вульф” і “Хейнкель”.

Савецкаму камандаванню ўдалося разгадаць планы ворага, і яно вырашыла спачатку выматаць яго ў абарончых баях, а пасля перайсці ў контрнаступленне. Гэты план быў бліскуча рэалізаваны. З 5 па 12 ліпеня Чырвоная Армія мужна адбівала варожы наступ. 12 ліпеня войскі Варонежскага фронту перайшлі ў контрнаступленне. У гэты дзень каля вёскі Прохараўкі адбылася самая буйная танкавая бітва Другой сусветнай вайны, ў якой з абодвух бакоў удзельнічала болей 1 100 танкаў і самаходных гармат. Паражэнне немцаў пад Прохараўкай прывяло да пералому ў Курскай бітве, якая нямецкімі войскамі была поўнасцю прайграна. 5 жніўня 1943 г. Чырвоная Армія вызваліла гарады Арол і Белгарад, у сувязі з чым у Маскве быў дадзены першы за час вайны артылерыйскі салют. 23 жніўня 1943 г. войскі Стэпавага фронту вызвалілі г. Харкаў, і гэтай падзеяй Курская бітва завяршылася.

Рэпазіторый БрДУ

Ацэньваючы вынікі Курскай бітвы прэм’ер-міністр Вялікабрытаніі У. Чэрчыль адзначыў: “Тры вялікія бітвы за Курск, Арол і Харкаў…адзначалі крушэнне германскай арміі на Ўсходнім фронце”.

3. Разгляд пытання можна пачаць з канстатацыі таго, што канцэнтрацыя 75% нямецкіх дывізій на Ўсходнім фронце дапамагла ЗША і Вялікабрытаніі дабіцца шэрагу поспехаў у барацьбе з дзяржавамі фашысцкага блока. У канцы 1942 г. у Паўночнай Афрыцы каля горада Эль-Аламейн англічане спачатку спынілі нямецка-італьянскае наступленне на Егіпет, а потым разграмілі нямецкую армію Э. Ромеля. Камандаваў англійскімі войскамі фельдмаршал Б. Мантгомеры. У пачатку мая 1943 г. англа-амерыканскія войскі акружылі ў Тунісе вялікую нямецка-італьянскую групоўку і прымусілі яе капітуляваць.

У ліпені 1943 г. саюзнікі захапілі востраў Сіцылію, а пасля высадзіліся на поўдні Апенінскага паўвострава. У сувязі з гэтым у Італіі пачаўся востры палітычны крызіс, які прывёў да арышту Мусаліні і яго змяшчэння з пасады кіраўніка ўрада. Новы ўрад сфарміраваў маршал Бадольё, які 3 верасня падпісаў пагадненне аб перамір’і і неўзабаве аб’явіў вайну Германіі. Гэтыя падзеі паклалі пачатак распаду фашысцка-мілітарысцкага блоку.

Поспех у ваенных дзеяннях спадарожнічаў саюзнікам на ціхаакіянскіх прасторах і Паўднёва-Ўсходняй Азіі. З лета 1942 г., пасля нанесенага амерыканцам паражэння японскаму флоту каля вострава Мідуэй, Японія стала ўступаць адну пазіцыю за другой. У пачатку 1943 г. японцы прайгралі бітву за востраў Гуадалканал (Саламонавы астравы).

Нарастанне барацьбы супраць краін фашысцкага блока патрабавала ўмацавання палітычнага супрацоўніцтва ўдзельнікаў антыгітлераўскай кааліцыі. 28 лістапада – 1 снежня 1943 г. у Тэгеране адбылася канферэнцыя кіраўнікоў трох дзяржаў: СССР, ЗША і Вялікабрытаніі. Асноўным пытаннем на ёй было адкрыццё другога фронту ў Заходняй Еўропе, які было вырашана адкрыць у маі 1944 г. У прынятай саюзнікамі дэкларацыі заяўлялася не толькі аб сумеснай барацьбе супраць Германіі, але і аб пасляваенным супрацоўніцтве трох дзяржаў.

## ТЭМА 9. ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ АД ГЕРМАНСКІХ ЗАХОПНІКАЎ.

Дадзеная тэма вымагае разгляду наступных пытанняў:

1. Пачатак вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
2. Беларуская наступальная аперацыя “Баграціён”.

Репозиторий БрГУ

Разгляд першага пытання першапачаткова патрабуе ўказання на тое, што пачатак вызвалення БССР звязаны з наступленнем Чырвонай Арміі восенню 1943 г. 28 верасня быў вызвалены першы раённы цэнтр Камарын, а 26 лістапада – першы абласны цэнтр Гомель. Плануючы далейшыя ваенныя дзеянні Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамдавання паставіла перад войскамі задачу разграміць нямецкую групу армій “Цэнтр” і ачысціць ад акупантаў усю тэрыторыю Беларусі. Аднак савецкае камандаванне не ўлічыла рэальных суадносін сіл бакоў. Стаўка меркавала, што немцы, якія панеслі вялікія страты ў летняй кампаніі 1943 г., не змогуць стрымаць наступленне савецкіх войскаў.

Наступленне Чырвонай Арміі працягвалася на шырокім фронце да канца года. Аднак гітлераўцы змаглі спыніць наступленне. Да канца 1943 г. войскі Заходняга фронту 7 разоў пераходзілі ў наступленне на Магілёўскім напрамку, але змаглі прасунуцца наперад толькі на 10–20 км. 14 студзеня 1944 г. быў вызвалены другі абласны цэнтр рэспублікі – Мазыр. Восенню і зімой 1943–1944 гг. Чырвоная Армія поўнасцю, або часткова вызваліла 36 раёнаў Беларусі. Пры гэтым ёй вялікую падтрымку і дапамогу аказвалі партызаны і цывільнае насельніцтва рэспублікі.

На вызваленай частцы тэрыторыі Беларусі аднаўлялася народная гаспадарка і розныя сацыяльныя аб’екты – бальніцы, аптэкі, дзіцячыя дамы і іншыя.

2. Пачынаючы разгляд другога пытання патрэбна падкрэсліць, што да лета 1944 г. на савецка-германскім фронце склаліся спрыяльныя ўмовы для наступальных дзеянняў Чырвонай Арміі, якая моцна ўтрымлівала стратэгічную ініцыятыву. Перад савецкімі войскамі была пастаўлена задача разграміць нямецкую групу армій “Цэнтр”, вызваліць Беларусь і выйсці да дзяржаўнай мяжы СССР.

Лінія савецка-германскага фронту летам 1944 г. уяўляла сабой выступ, вядомы як “беларускі балкон”. Утрыманню гэтага выступу нямецкае камандаванне надавала асаблівае значэнне. Уздоўж яго была створана магутная лінія абароны, якую назвалі “Фатэрлянд” (“Айчына”). Гэтым падкрэслівалася, што нямецкая армія абараняе тут рубяжы самой Германіі.

У красавіку – маі 1944 г. Генеральны штаб Чырвонай Арміі распрацаваў план аперацыі “Баграціён”. Для яго ажыццяўлення прыцягваліся сілы чатырох франтоў: 1-га Беларускага (камандуючы генерал арміі К. Ракасоўскі), 2-га Беларускага (камандуючы генерал-палкоўнік Г. Захараў), 3-га Беларускага (камандуючы генерал-лейтэнант І. Чарняхоўскі), 1-га Прыбалтыйскага (камандуючы генерал арміі І. Баграмян), а таксама Дняпроўская флатылія і беларускія партызаны, якія

Рэпазіторый БрДУ

20 чэрвеня, за тры дні да аперацыі "Баграціён", пачалі трэці этап "рэйкавай вайны".

У вызваленні Беларусі таксама прымалі ўдзел Першая польская дывізія імя Т. Касцюшкі і французскі авіяполк "Нармандыя – Нёман".

Далей неабходна вызначыць два этапы аперацыі "Баграціён" і іх змест. На першым этапе (23 чэрвеня – 4 ліпеня 1944 г.) былі паспяхова праведзены Віцебска–Аршанская, Магілёўская, Бабруйская і Полацкая аперацыі, была акружана Мінская групоўка праціўніка. У гэты перыяд былі вызвалены абласныя цэнтры Віцебск (26 чэрвеня), Магілёў (28 чэрвеня), а таксама сталіца Беларускай ССР г. Мінск (3 ліпеня). Ён быў вызвалены танкавым корпусам генерала Бурдзейнага. Першым у Мінск уварваўся танк камандзіра ўзвода Дз. Фролікава. У мінскім "катле" было акружана, а пасля ўзята ў палон 105-тысячная групоўка нямецкіх войск. Сёння дзень 3-га ліпеня адзначаецца як Дзень вызвалення Беларусі і як Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі).

На другім этапе аперацыі "Баграціён" (5 ліпеня – 29 жніўня 1944 г.) былі праведзены Шаўляйская, Вільнюская, Каўнаская, Беластоцкая і Люблін-Брэсцкая аперацыі, у выніку чаго ўся тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Аперацыя "Баграціён" па вызваленні Беларусі з'яўляецца бліскучым прыкладам савецкага ваеннага мастацтва. Яна ўвайшла ў падручнікі па ваеннай гісторыі многіх краін свету.

У пасляваенны час на 21-м кіламетры шашы Мінск–Масква быў узведзены велічны Курган Славы – помнік ў гонар воінаў чатырох франтоў, якія вызвалілі Беларусь.

## ТЭМА 10. САВЕЦКІ ТЫЛ У ГАДЫ ВАЙНЫ.

Змест дадзенай тэмы вызначаюць наступныя пытанні:

1. Перавод эканомікі СССР на ваеннае становішча.
2. Працоўны подзвіг савецкага народа.
3. Культурнае і духоўнае жыццё ў савецкім тыле.

Разгляд першага пытання пачнем з канстатацыі таго, што вайна запатрабавала забяспячэння фронта ўсім неабходным для барацьбы з ворагам. Без адзінства фронта і тыла дасягненне перамогі ў вайне было б немагчыма. Аднак акупацыя важнейшых эканамічных раёнаў СССР паставіла яго гаспадарку ў надзвычай складаныя ўмовы. На захопленай тэрыторыі да вайны пражывала 40% насельніцтва краіны, выраблялася 1/3 частка валавай прадукцыі, вырошчвалася 38% збожжа, мелася 60% свіней і 38% буйной рагатай жывёлы.

Рэпазіторый БрДУ

Гэтыя велізарныя страты абцяжарвалі задачу задавальнення разнастайных патрэб фронта. Тым не менш з першых дзён вайны рабілася ўсё магчымае каб перавесці народную гаспадарку на ваенныя рэйкі. У краіне была ўведзена абавязковая працоўная павіннасць, усталёўваўся надзвычайны парадак работы для ўсіх дзяржаўных устаноў, прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў. Звычайнай практыкай стала звышурочная праца.

Ужо 30 чэрвеня 1941 г. ЦК УКП(б) і СНК СССР прынялі народна-гаспадарчы план на 3-ці квартал, які прадугледжваў у самыя сціслыя тэрміны пачаць мабілізацыю матэрыяльных і працоўных рэсурсаў для патрэб абароны. Планам таксама прадугледжвалася тэрміновая эвакуацыя насельніцтва, устаноў, прадпрыемстваў і маёмасці з раёнаў, якім пагражала германская акупацыя.

Намаганнямі савецкіх людзей Урал, Заходняя Сібір і Сярэдняя Азія былі пераўтвораны ў магутную ваенна-прамысловую базу. Рост ваеннай вытворчасці адбываўся за кошт інтэнсіфікацыі працы, павышэння працягласці працоўнага дня, ўмацавання працоўнай дысцыпліны. У лютым 1942 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР выдаў Загад “Аб мабілізацыі працаздольнага гарадскога насельніцтва для работы ў вытворчасці і будаўніцтве на перыяд ваеннага часу”. Паводле Загаду мабілізаваліся мужчыны і жанчыны пэўнага ўзросту, якія не былі заняты на прадпрыемствах у дзяржаўных установах. Працоўныя рэсурсы СССР складалі ў 1944 г. 23 млн. чалавек, палову з якіх складалі жанчыны. Нягледзячы на гэта, у 1944 г. СССР штомесячна выпускаў 5,8 тыс. танкаў, 13,5 тыс. самалётаў, у той час як Германія 2,3 і 3 тыс. адпаведна.

Адзначым, што перавод народнай гаспадаркі на ваеннае становішча ўжо поўнасцю завяршыўся ў сярэдзіне 1942 г. Гэта яскрава сведчаць пра вялікія мабілізацыйныя магчымасці савецкай ваенна-палітычнай і эканамічнай сістэмы.

2. Дасягненні савецкай эканомікі ў перыяд вайны сталі вынікам працоўнага гераізму савецкіх людзей. У неймаверна цяжкіх умовах, не шкадуючы сіл і здароўя, яны працавалі пад лозунгам “Усё для фронта, усё для перамогі над ворагам”. Шырокі размах набыло сацыялістычнае спаборніцтва за выпуск звышпланавай прадукцыі. У 1943 г. разгарнуўся рух маладзёжных брыгад па ўдасканаленні вытворчасці, выкананні і перавыкананні планаў, за дасягненне высокіх вынікаў з меншай колькасцю рабочых. Дзякуючы гэтаму значна павялічыўся выпуск баявой тэхнікі, узбраенняў і боепрыпасаў.

Важкі ўклад у перамогу над ворагам унеслі савецкія вучоныя. Авіяканструктары А. Якаўлеў, С. Лавачкін, А. Мікаян, М. Гурэвіч, С. Ільюшын, В. Петлякоў, А. Тупалеў стварылі новыя тыпы самалётаў, якія

Рэпазіторый БрДУ

пераўзыходзілі нямецкія. Распрацоўваліся новыя ўзоры танкаў. Лепшы танк Другой сусветнай вайны – Т-34 – быў створаны канструктарам М. Кошкіным.

Значны ўклад у ваенную эканоміку СССР унеслі працоўныя Беларусі, якія былі эвакуіраваны на ўсход краіны. Да лета 1942 г. на абарону працавалі звыш 60-ці беларускіх прадпрыемстваў. За кароткі тэрмін у Заходняй Сібіры пачалі вытворчасць ваеннай прадукцыі эвакуіраваныя сюды Гомсельмаш і Гомельскі станкабудаўнічы завод, Віцебскі станкабудаўнічы завод імя Камінтэрна, Віцебская фабрыка “Сцяг індустрыялізацыі” і іншыя.

У 1943 г. на станцыі Сходня пад Масквой аднавіў работу Беларускі дзяржаўны універсітэт, а ў Яраслаўлі – Мінскі медыцынскі інстытут.

Ва ўсходнія раёны краіны выехала каля 1,5 млн. працоўных Беларусі і было эвакуіравана звыш 120 прамысловых прадпрыемстваў. У цэлым за гады Вялікай Айчыннай вайны ва ўсходніх раёнах СССР былі пабудаваны 2 250 буйных прадпрыемстваў, сярод якіх былі такія гіганты індустрыі, як Чалябінскі металургічны завод, Нарыльскі нікелевы камбінат, Алтайскі трактарны завод і іншыя.

Многія ўраджэнцы Беларусі сталі сапраўднымі героямі тыла. Сярод іх – рабочыя Гомельскага станкабудаўнічага завода імя Кірава А. Жароўня, І. Дзівеня, Л. Лакрыца, М. Касавы, М. Шантаровіч. У многім дзякуючы ім калектыў завода за гады вайны тройчы заваёўваў першае і 6 разоў другое месца ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве сярод заводаў Наркамата станкабудавання.

Першай маладзёжнай камсамольска-маладзёжнай брыгадай на заводзе “Гомсельмаш” стала брыгада Ф. Мельнікава, якая пераважна складалася з гамельчан. План 1943 г. брыгада выканала на 224%. Яна шматразова прызнавалася лепшай франтавой камсамольска-маладзёжнай брыгадай Курганскай вобласці.

Гісторыя савецкага тылу ведае многія сотні і тысячы прыкладаў гераічнай працы, якая мела не меншае значэнне, чым гераічная барацьба на фронце. Нездарма сказана, што “из одного металла льют медаль за бой, медаль за труд».

3. Важкі ўклад у перамогу ўнесла савецкая шматнацыянальная культура, якая ўздымала настрой воінаў, натхняла іх на бязлітасную барацьбу з ворагам. Распаўсюджанай практыкай стаў выезд канцэртных брыгад на фронт. Першай выехала на фронт 4 ліпеня 1941 г. брыгада Ленінградскай эстрады. У перыяд вайны было сфарміравана 3 800 франтавых брыгад, якія налічвалі 40 тыс. артыстаў розных жанраў. Яны выступалі сярод воінскіх часцей, у шпіталях, на прызыўных пунктах, давалі канцэрты ў тылавых гарадах, вёсках, на абарончых прадпрыемствах.

Рэпазіторый БрДУ

У 1942–1945 гг. галоўнае месца ў літаратуры, музыцы, тэатры, кіно, выяўленчым мастацтве займала тэма мужнасці, патрыятызму, барацьбы за свабоду Радзімы. З'явіліся творы В. Гросмана «Народ безсмяротны», К. Сіманава «Дні і ночы», М. Шолахава «Яны змагаліся за Радзіму». Надзвычай важнае месца сярод літаратурных твораў заняла паэма А. Твардоўскага «Васіль Цёркін». Кампазітар А. Аляксандраў і паэт В. Лебедзеў-Кумач стварылі своеасаблівы гімн Вялікай Айчыннай вайны – песню-набат «Свяшчэнная вайна».

У сакавіку 1942 г. на Усесаюзным радыё ўпершыню прагучала 7-я сімфонія кампазітара Дз. Шастаковіча, а ў жніўні адбылася прэм'ера гэтага твора ў блакадным Ленінградзе. Адным з самых яркіх графічных твораў стаў плакат мастака І. Таідзе «Радзіма – маці кліча». Вялікай папулярнасцю карысталіся карыкатуры і плакаты групы мастакоў Кукрыніксы.

У гады вайны ў савецкім тыле працягвалі працаваць і многія беларускія дзеячы навукі і культуры, аб чым можна даведацца з розных крыніц. Важнае месца ў духоўнай культуры ваеннага часу займала царква, якая выхоўвала ў людзей патрыятызм, высокія маральныя і агульначалавечыя якасці, падтрымлівала і ўмацоўвала веру народа ў перамогу над сіламі зла і нянавісці.

## ТЭМА 11. ЗАКАНЧЭННЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ І ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВОЙНАЎ.

Змест дадзенай тэмы прадвызначаюць наступныя пытанні:
1. Вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Еўропу.
2. Канчатковы разгром і капітуляцыя фашысцкай Германіі.
3. Разгром і капітуляцыя мілітарысцкай Японіі.

Асвятленне першага пытання неабходна пачаць з канстатацыі таго, што да восені 1944 г. завяршылася вызваленне тэрыторыі Савецкага Саюза. Камандаванне Чырвонай Арміі трывала ўтрымлівала стратэгічную ініцыятыву ў сваіх руках. Ужо ніхто ў свеце не сумняваўся ў перамозе ў вайне антыгітлераўскай кааліцыі. Паскарэнне разгрому фашысцкай Германіі і яе сатэлітаў садзейнічала высадка англа-амерыкана-канадскіх войск на ўзбярэжжа Паўднёвай Францыі 6 чэрвеня 1944 г. Так быў адкрыты другі фронт у Еўропе.

Са свайго боку Чырвоная Армія ў другой палове 1944 г. – пачатку 1945 г. правяла шэраг буйных наступальных аперацый па вызваленні народаў еўрапейскіх краін (з гэтымі аперацыямі студэнтам прапаноўваецца пазнаёміцца самастойна). Яна пазбавіла ад германскага рабства 11 краін

Репозиторий БрГУ

Цэнтральнай і Паўднёва-Ўсходняй Еўропы з насельніцтвам 113 млн. чалавек. Кожная атрыманая перамога была аплачана вельмі дарагой цаной. У баях за свабоду і незалежнасць еўрапейскіх краін аддалі сваё жыццё каля 1 млн. савецкіх воінаў.

Разам з тым неабходна адзначыць, што ўступленне Чырвонай Арміі ў краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы было выкарыстана савецкім кіраўніцтвам для навязвання народам гэтых краін сваёй волі і сваёй мадэлі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця. Гэта дало падставы шэрагу палітыкаў на Захадзе сцвярджаць, што народы Еўропы сталі ахвярамі савецкага вызвалення. Гэтыя абставіны ў многім прадвызначалі адносіны да СССР у пасляваеннай Еўропе.

Напрыканцы ліпеня 1944 г. агульнае наступленне пачалі саюзнікі, у выніку якога былі вызвалены Францыя і большая частка Бельгіі. Саюзныя арміі падышлі да межаў Германіі.

У выніку паспяховых наступальных дзеянняў Чырвонай Арміі з усходу і англа-амерыканскіх войскай з захаду становішча гітлераўскай Германіі стала катастрафічным. Каб узгадніць свае дзеянні была праведзена 4–11 лютага 1945 г. Крымская (Ялцінская) канферэнцыя кіраўнікоў і “вялікай тройкі”: І. Сталіна, Ф. Рузвельта і У. Чэрчыля. На ёй саюзнікі ўзгоднілі планы канчатковага разгрому Германіі і Японіі, разгледзелі пытанні аб акупацыі Германіі саюзнымі войскамі і кіраванні Берлінам, вызначылі прынцыпы пасляваеннага ўладкавання свету і міжнароднай бяспекі. Было таксама дамоўлена аб выплаце Германіяй рэпарацый і аб скліканні Ўстаноўчай канферэнцыі Арганізацыі Аб’яднаных Нацый (ААН). Дасягнута ўзаемаразуменне саюзнікаў па югаслаўскім і польскім пытанням.

Рашэнні Крымскай канферэнцыі садзейнічалі ўмацаванню адзінства саюзнікаў і хутчэйшаму дасягненню перамогі.

2. Завяршальнай стратэгічнай наступальнай аперацыяй Чырвонай Арміі ў вайне з Германіяй стала бітва за Берлін, якая адбывалася з 16 красавіка па 8 мая 1945 г. У ёй прымалі ўдзел войскі 1-га і 2-га Беларускіх і 1-га Украінскага франтоў сумесна з Балтыйскім флотам і Дняпроўскай флатыліяй, а таксама 1-я і 2-я армія Войска Польскага. Англа-амерыканскія войскі, якія наступалі з захаду, прасоўваліся ў накірунку р. Эльбы. 25 красавіка ў раёне г. Таргау адбылася сустрэча саюзнікаў. Савецкія войскі завяршылі акружэнне германскай сталіцы і 2 мая штурмам узялі Берлін. Перад гэтым, 30 красавіка, А. Гітлер скончыў жыццё самагубствам. У ноч з 8 па 9 мая у Берліне прадстаўнікі германскага вярхоўнага камандавання падпісалі акт аб безумоўнай капітуляцыі Германіі. Вярхоўная ўлада ў Германіі адышла да акупіраваўшых яе дзяржаў. Такім чынам вайна ў Еўропе скончылася,

Репозиторий БрГУ

скончылася і Вялікая Айчынная вайна савецкага народа. 9 мая савецкая краіна святкавала Дзень Перамогі. 24 чэрвеня 1945 г. у Маскве адбыўся Парад Перамогі, якім камандаваў Маршал Савецкага Саюза К. Ракасоўскі, а прымаў яго намеснік Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршал Савецкага Саюза Р. Жукаў (“Маршал Перамогі”).

Пасля капітуляцыі Германіі з 17 ліпеня па 2 жніўня 1945 г. адбылася Патсдамская (Берлінская) канферэнцыя кіраўнікоў краін-пераможцаў: СССР (І. Сталін), ЗША (Г. Трумэн) і Вялікабрытаніі (У. Чэрчыль, з 28 ліпеня – К. Этлі). На ёй саюзнікі падцвердзілі рашэнні Крымскай канферэнцыі. У адносінах да Германіі яны дамовіліся праводзіць формулу “ЗД” – дэмакратызацыі, дэмілітарызацыі і дэнацыфікацыі Германіі.

Саюзнікі ўзгаднілі пытанні аб пакаранні ваенных злачынцаў, заходняй мяжы Польшчы, перадачы СССР г. Кёнісберга (сёння – Калінінград) і прылягаючых да яго раёнаў. Для правядзення суда над ваеннымі злачынцамі было вырашана стварыць Міжнародны ваенны трыбунал. Канферэнцыя даручыла новастворанаму органу – Савету міністраў замежных спраў – падрыхтоўку мірных дагавораў з былымі саюзнікамі Германіі.

3. 9 мая 1945 г. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа скончылася, а Другая сусветная вайна яшчэ працягвалася, бо саюзнікам яшчэ супрацьстаяла мілітарысцкая Японія. Яшчэ 5 красавіка 1945 г. савецкі ўрад дэнансіраваў дагавор з Японіяй аб нейтралітэце. Верны сваім саюзніцкім абавязательствам Савецкі Саюз 8 жніўня 1945 г. аб’явіў ёй вайну. 9 жніўня – 2 верасня 1945 г. войскі Забайкальскага, 1-га і 2-га Далёкаўсходніх франтоў, сілы Ціхаакіянскага флота і Амурскай ваеннай флатыліі ажыцявілі Маньчжурскую стратэгічную наступальную аперацыю, акружылі і разгромілі адборную, больш чым 1-мільённую Квантунскую армію. Адначасова былі праведзены Паўднёвасахалінская (11–25 жніўня) і Курыльская дэсантныя (18 жніўня – 1 верасня) аперацыі, ў выніку якіх СССР вярнуў у свой склад Паўднёвы Сахалін і Курыльскія астравы.

6 і 9 жніўня 1945 г. амерыканцы скінулі па адной атамнай бомбе на японскія гарады Хірасіма і Нагасакі. Ахвярамі гэтых бамбардзіровак сталі 114 тыс. мірных жыхароў. Гэты акт ваенна-палітычнага кіраўніцтва ЗША не быў выклікаPны ваеннай неабходнасцю, а тлумачыўся палітычнымі матывамі і быў накіраваны перш за ўсё на ўмацаванне амерыканскага ўплыву на міжнароднай арэне пасля вайны. Разам з тым, ён зламаў волю да супраціўлення японскага ваеннага і палітычнага кіраўніцтва і аб’ектыўна спрыяў хутчэйшаму завяршэнню вайны.

2 верасня 1945 г. на борце амерыканскага лінкора “Місуры” ў Такійскім заліве быў падпісаны акт аб безумоўнай капітуляцыі Японіі. Другая сусветная вайна скончылася. Галоўным яе вынікам стала

Репозиторий БрГУ

выратаванне сусветнай цывілізацыі, стварэнне ўмоў для жыцця і развіцця чалавецтва па шляху прагрэсу. Галоўны яе ўрок заключаецца ў тым, што з вайной неабходна змагацца, пакуль яна яшчэ не пачалася. А гэта азначае настойлівую барацьбу ўсіх краін і народаў за мір на ўсёй зямлі.

Репозиторий БрГУ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Гістарычную памяць аб Вялікай Айчыннай вайне, мужнасці і гераізме савецкіх салдат і афіцэраў, савецкіх партызан, працаўнікоў тыла не адняць у народаў Расіі, Украіны і Беларусі. За час вайны ордэнамі і медалямі было ўзнагароджана больш за 7 млн. ваенаслужачых. Звыш 11 тыс. чалавек удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Сярод іх: 8160 рускіх, 2069 украінцаў, 1309 беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі і многа прадстаўнікоў іншых нацый і народнасцей.

Важкі ўклад у разгром ворага ўнёс беларускі народ. Звыш 1,3 млн. байцоў знаходзіліся ў радах Чырвонай Арміі, 374 тыс. чалавек удзельнічалі ў партызанскім руху, 70 тыс. чалавек вялі барацьбу ў падполлі, амаль 400 тыс. жыхароў Беларусі складалі партызанскія рэзервы, некалькі тысяч ураджэнцаў Беларусі змагаліся ў радах еўрапейскага руху Супраціўлення.

Памяць пра Другую сусветную вайну павінна быць скіравана на сцвярджэнне адзінства міру і згоды. У рэзалюцыі ГА ААН гаворыцца, што гістарычная Перамога ў маі 1945 г. стварыла ўмовы для заснавання ААН, што з гэтага часу 8 і 9 мая будуць штогод адзначацца як дзень памяці ахвяраў Другой сусветнай вайны.

Репозиторий БрГУ

ЛІТАРАТУРА

1. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : Энцыклапедыя. Мінск, 1990.
2. Белорусские остарбайтеры: Угон населения Белоруссии на принудительные работы в Германию (1941–1944): Документы и материалы : в 4 кн. / сотс. Г.Д. Кнатько, В.И. Адамушко [и др.]. – Минк : НАРБ, 1996–2001. – 4 т.
3. Великая Отечественная война 1941–1945 : энцикл. / гл. ред. М.М. Козлов – М. : Сов. Энцикл., 1985. – 832 с.
4. В непокоренном Минске: Документы и материалы о подпольной борьбе советских патриотов в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) / Институт истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС : сост.: Л.В. Аржаева, П.И. Липило, редкол.: К.Н. Платонов (пред.) [и др.]. – Минск : Беларусь, 1987. – 384 с.
5. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : документы и материалы : в 3 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ, Ин-т истории АН БССР : сост.: Р.Р. Крючок. П.П. Липило. – Минск : Беларусь, 1967–1982. – Т. 1. – 1967. – 744 с.
6. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : документы и материалы : в 3 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ, Ин-т истории АН БССР : сост.: З.И. Белуга, Г.Н. Шевела. – Минск : Беларусь, 1967–1982. – Т. 2. – Кн. 1. – 1973. – 680 с. ; Т. 2. – Кн. 2. – 1978. – 814 с.
7. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : документы и материалы : в 3 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ, Ин-т истории АН БССР : сост.: З.И. Белуга, Г.Н. Шевела. – Минск : Беларусь, 1967–1982. – Т. 3. –1982. – 792 с.
8. Зборнік лістовак усенароднай партызанскай барацьбы ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1944) / Ін-т гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б Беларусі – філіял Ін-та марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС ; пад рэд. Ц.С. Гарбунова, Ф.А. Новікава, І.П. Кожара. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1952. – 547 с.
9. Комсомол Белоруссии в Великой Отечественной войне : док. и материалы / Ин-т истории партии при ЦК КПБ ; сост.: Г.Н. Шевела. – Минск : Беларусь, 1988. – 495 с.
10. Лагерь смерти Тростенец : док. и материалы / сост. В.И. Адамушко, Г.Д. Кнатько [и др.]. – Минск : Нац. архив Республики Беларусь. – 2003.
11. Лагеря советских военнопленных в Беларуси, 1941–1944 : справ. / Гос. ком. по арх. и делопроизводству при Совете Министров Республики Беларусь, Нац. архив Республики Беларусь, Бел. гос. Музей

Репозиторий БрГУ

Великов Отечественной войны, Бел. респ. Благотворительный фонд «Взаимопонимание и примирение»; В.И. Адамушко [и др.]. – Минск : Нац. архив Республики Беларусь. – 2003. – 61 с.
12. Мировые войны XX века: Вторая мировая война. Документы и материалы. Кн. 4. М., 2002.
13. Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941–1944) : зб. / пад рэд. У.М. Міхнюка. – Мінск : БелНДІДААС, 1995. – 416 с.
14. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944). Краткие сведения об организационной структуре партизанских соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / А.Н. Манаенков, Е.П. Горелик, А.Ф. Маркова [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983. – 765 с.
15. Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941–1944). Краткие сведения об организации, структуре и составе / Институт истории партии при ЦК КПБ ; сост. А.А. Кузняев. – Миснк : Беларусь, 1975. – 272 с.
16. Сталинградская эпопея. М., 2000. Энциклопедия Третьего Рейха. М., 1996.
17. Беларусь в первые месяцы Великой Отечественной войны.(22 июня – август 1941 гг.): док. и материалы / сост.: В.И Адамушко [и др.]. – Минск : НАРБ, 2006. – 457 с.
18. Органы государственной безопасности СССР в Великой Отечественной войне. Сборник документов. Том I. Накануне. Книга первая (ноябрь 1938 г. – декабрь 1940 г.) / ред. колл. С.В. Степашин и др. – Москва : Академия ФСК России, 1995 г.– 452 с.
19. Накануне. Западный особый военный округ (конец 1939 г. – 1941 г.). док. и материалы / сост.: В.И Адамушко [и др.]. – Минск : НАРБ, 2007. – 622 с.
20. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны (верасень 1939 г. – верасень 1945 г.) // Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Мінск, 2003. Ч.2. С. 217-279.
21. Беларусь у выпрабаваннях Вялікай Айчыннай вайны : массавыя забойствы нацыстаў : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 2 ліп. 2005 г. / Гістарычная майстэрня ў Мінску, Міжнародны адукацыйны цэнтр у Дортмундзе і [інш] ; адк. рэд.: Н.Ф. Балакіраў, К.І. Козак. – Мінск, 2005. – 306 с.
22. Беларусь в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945 гг. / А.А. Коваленя (рук. авт. коллектива), А.М. Литвин, В.И, Кузьменко [и др.]. – Минск : Белта, 2005. – 544 с.
23. Долготович Б.Д. Военачальники – сыны Беларуси на фронтах Великой Отечественной войны. Минск , 2003.
24. Каваленя А.А. Беларусь у гады другой сусветнай вайны (1939–1945 гг.) / А.А. Каваленя. – Мінск : БДПУ, 1996. – 183 с.

Репозиторий БрГУ

25. Каваленя А.А. Беларусь у выпрабаваннях вайны (1939–1945 гг.): Вучэбна-метадычны дапаможнік. Мінск., 2001.
26. Коваленя, А.А. Беларусь 1939–1945 гг. Война и политика. Минск : Веды, 2001. – 204 с.
27. Аблова, Р.Т. Это было в Белоруссии: Из истории борьбы молодежи в партизанских отрядах и подполье / Р.Т. Аблова. – М. : Молодая гвардия, 1957. – 192 с.
28. Басюк, И.А. Пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі : манагр. / И.А. Басюк. – Гродна: ГрДУ, 2003 – 238 с.
29. Бяспанскі, С.І. Наступальныя аперацыі Чырвонай Арміі ў Беларусі (восень 1943 – вясна 1944) / С.І. Бяспанскі // Беларус. гіст. часоп. – 2004. – № 1. – С. 24–28.
30. Василевский, А. М. Дело всей жизни. М., 1983.
31. Віцьбіч, Ю. Партызанская барацьба на Беларусі / Ю. Віцьбіч // Спадчына. – 1998. – №1. – С. 127–146 (9).
32. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3-х т. / Ин-т истории партии при ЦК КП(б)Б – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС ; гл. редкол.: А.Г. Кузьмин (пред.) [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983-1985.
33. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975 гг. – Т. 4 : Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1941–1945 гг.) ; рэдкал.: І.М. Ігнаценка (старшыня) [і інш.]. – 1975. – 640 с.
34. Гребенкина, А.А. Брест непокоренный. Антифашистское подполье в г. Бреста и Брестского района в годы Великой Отечественной войны (1941–1944) : ист. очерк / А.А. Гребенкина. – Минск : БелЭН, 2005 – 328 с.
35. Здановіч, У. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1944) у адлюстраванні айчыннай гістарыяграфіі / У. Здановіч. – Брэст : БрДУ ім. А.С. Пушкіна, 2008.
36. Каваленя, А.А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць. – Мінск : БДПУ імя М. Танка, 1999. – 260 с.
37. Кузьменко, В. И. Советская интеллигенция в партизанском движении в Белоруссии / В.И. Кузьменко; под ред. А.Ф. Юденкова. Минск : Наука и техника, 1991. – 118 с.
38. Літвін, А.М. Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі / А.М. Літвін. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2000. – 288 с.
39. Рокоссовский К.К. Солдатский долг. М., 1988.
40. Туронак, Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / пер. з польскай В. Ждановіч, кам. А.М. Літвіна / Ю. Туронак. – Мінск : Беларусь, 1993. – 236 с.

Репозиторий БрГУ